ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і Памяльнцы
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
# Дзедзіч
*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*
№ 5 (24)
ЛІСТАПАД 2003

2 АПОШНЯЯ ВОСЕНЬ «ВЯСНЫ» Улады рыхтуюцца да рэферэндума
6 ГІСТОРЫЯ КАТАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ
4 А.ЛУКАШЭНКА – ВЫПАДКОВЫ ПРЭЗІДЭНТ
8 СЛУХАЙ СВАЁ. НОВЫ МУЗЫЧНЫ ПРАЕКТ У ІНТЭРНЭЦЕ

# "ВЯСНУ" ЗАКРЫЛІ

28 КАСТРЫЧНІКА ВЯРХОЎНЫ СУД РБ ВЫНЕС РАШЭННЕ АБ ЛІКВІДАЦЫІ ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ "ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР "ВЯСНА". ГЭТАЯ ПАДЗЕЯ – ЧАРГОВЫ ЭТАП РЭПРЭСІЯЎ УЛАДАЎ СУПРАЦЬ ТЫХ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ЯКІЯ МАЮЦЬ АДРОЗНЫ АД АФІЦЫЙНАГА ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ НА СІТУАЦЫЮ Ў КРАІНЕ.


Алесь Бяляцкі, кіраўнік ПЦ «Вясна», падчас акцыі пратэсту ў будынку Вярхоўнага суда РБ. Фота: ByMedia.

Калі проста пералічыць усе арганізацыі, што былі зліквідаваныя ў краіне на працягу бягучага года, то месца на гэтай старонцы хапіла б яшчэ толькі на тое, каб назваць галоўнага ініцыятара ганенняў супраць дэмакратычных сіл. Зрэшты, вы ўсе і так яго ведаеце, таму не будзем марнаваць на гэта газетную плошчу.

Звычайна прычэпкамі для ліквідацыі НДА (так званых недзяржаўных арганізацый) з'яўляюцца фармальныя парушэнні шматлікіх нарматыўных актаў, пастаноў, рэкамендацый і ўказаў, датычных правілаў справаводства, бухгалтэрыі, вырабу пячаткі ці выкарыстання фірмовых бланкаў, сімволікі і г.д. У развітых краінах НДА вядуць справаводства і выконваюць іншыя фармальнасці па спрошчанай схеме, таму як там чынавенства разумее, што патрабаваць выканання усіх бюракратычных "замарочак" ад некамерцыйнай арганізацыі немагчыма. Натуральна, што не маючы аніякай падтрымкі ад улады, якая называе сябе дэмакратычнай, беларускія НДА не могуць дазволіць сабе раскошу мець у штаце прафесійнага бугалтара, юрыста, кадравіка і справаводцу. Звычайна гэтыя функцыі выконвае на валанцёрскіх пачатках хтосьці з больш-менш падрыхтаваных сябраў НДА.

Іншая справа, што на пэўныя парушэнні час ад часу можна заплюшчыць вочы, а аднойчы, калі дзейнасць арганізацыі не спадабаецца пэўным асобам, можна прыйсці з фармальнай праверкай і на наступны дзень арганізацыі не будзе. Прычым незалежна ад таго, падтрымлівае НДА афіцыйную ўладу ці выступае супраць – зачыніць з фармальных прычын сёння можна ўсіх.

Вось "Вясна" і стала чарговай ахвярай гіпертрафіраванага імкнення чыноўнікаў Міністэрства юстыцыі выконваць закон.

Але, як вы, канешне, разумееце, насамрэч прычынай ліквідацыі "Вясны" ёсць яе актыўная праваабарончая дзейнасць, якая не падабаецца пэўным колам сённяшняй улады. Дапамога ахвярам палітычных рэпрэсіяў, адстойванне правоў актывістаў дэмакратычнага руху і звычайных грамадзян, назіранне за чысцінёй, празрыстасцю і адпаведнасцю заканадаўству выбарчых кампаніяў і іх крытычная ацэнка, актыўная пазіцыя лідэраў "Вясны" у змаганні за правы чалавека, за аднаўленне дэмакратыі ў Беларусі, – вось тыя "парушэнні", якія выявілі дзяржаўныя органы ў дзейнасці "Вясны".

Сапраўды, каму спадабаюцца абгрунтаваныя абвінавачванні ў махлярстве, фальшаванні вынікаў выбараў, парушэннях правоў чалавека? І каб не чуць такой непрыемнай праўды, улады пайшлі на крок, які ў чарговы раз паказаў усёй Еўропе сапраўднае аблічча сучаснага рэжыму і выклікаў магутную хвалю абурэнняў у дыпламатычных колах.

Ліквідацыя "Вясны" – моцны ўдар па пазіцыях дэмакратычнага руху. Але, маючы трохгадовы досвед працы ў нефармальным статусе (пасля ўтварэння "Дзедзіч" доўга дамагаўся рэгістрацыі) мы ўпэўненыя, што праца "Вясны" не спыніцца ні на хвіліну. Знішчылі арганізацыю, адабралі права вылучаць назіральнікаў на выбары, адстойваць правы чалавека, але не адабралі і ніколі не адбяруць права быць актыўнымі грамадзянамі, адданымі патрыётамі сваёй Радзімы, якімі былі і застануцца ўсе "вясноўцы"!

БАМГА "Сузор'е" выказвае шчырую салідарнасць з сябрамі Праваабарончага цэнтра "Вясна" і жадае ім мужнасці, трываласці і цярпення ў справе пабудовы дэмакратычнай прававой еўрапейскай дзяржавы. Мы заўсёды гатовыя аказаць усемагчымую дапамогу супрацоўнікам берасцейскага аддзялення "Вясны" і перакананыя ў тым, што разам мы здолеем выстаяць у самых неспрыяльных для жыцця ўмовах!

**Ад імя ўсіх "дзедзічаў"**
**Старшыня Рады БАМГА "Сузор'е"**
**Дзмітрый ШЫМАНСКІ**

## ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!

**– Калі Вы падзяляеце нашыя погляды на сучасную сітуацыю ў Беларусі і нашыя надзеі на будучыню,**

**– калі Вы жадаеце супрацоўнічаць з намі, стаць сябрамі "Сузор'я" ці проста перадаць цікавую інфармацыю,**

**паведамляем, што**
**звязацца з намі можна праз распаўсюджвальнікаў нашай газеты, альбо па тэл.: 20-57-41 з 18.00 да 21.00.**
**Маб.: (029) 660-57-41, (029) 725-15-39.**

## МЫ ЧАКАЕМ ВАС!

**Будзем удзячныя таксама за канструктыўныя заўвагі і прапановы.**

**Прэс-служба БАМГА "Сузор'е"**

## АДНЫМ РАДКОМ

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Фонд "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Калі вы ведаеце МА ў вашым рэгіёне, якія былі б зацікаўлены ў атрыманні нашай рассылкі і ў асвятленні сваёй працы на яе старонках, просім паведаміць нам іх кантакты.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

### У АМАТАРАЎ ФУТБОЛЬНАЙ КАМАНДЫ "БАРАНАВІЧЫ" БУДЗЕ СВОЙ ФАН-КЛУБ

З канца жніўня баранавіцкія аматары футболу маюць магчымасць бліжэй пазнаёміцца са сваёй камандай дзякуючы газеце "Баранавіцкі футбол", выпуск якой наладзіла ініцыятыўная група моладзі пад кіраўніцтвам Алеся Пікулы – аднаго з лідэраў дэмакратычнага грамадскага руху горада.

Па словах сп. Алеся, газета выходзіць 2 разы на месяц, перад кожным хатнім матчам, і карыстаецца вялікім попытам у балельшчыкаў, што прыходзяць на стадыён падтрымаць сваю каманду. Тым больш, што распаўсюджваецца яна бясплатна.

У газеце змяшчаюцца інтэрв'ю з трэнерамі і футбалістамі, аналіз выязных матчаў, матэрыялы па гісторыі баранавіцкага футболу, конкурсы і віктарыны.

А ў бліжэйшых планах моладзевай выдавецкай ініцыятывы – стварэнне фан-клубу балельшчыкаў "Баранавічаў" пры падтрымцы кіраўніцтва футбольнага клубу.

Думаецца, што не ў апошнюю чаргу дзякуючы гарачай падтрымцы сваіх балельшчыкаў, натхнёных матэрыяламі газеты "Баранавіцкі футбол", каманда "Баранавічы" зараз трывала займае першае месца ў турнірнай табліцы чэмпіяната РБ у 2-й лізе і ўжо ў наступным сезоне будзе гуляць сярод каманд першай лігі. З чым мы і віншуем усіх аматараў футболу 8-га па вялічыні горада краіны.

А балельшчыкам "Дынама" (Берасце) раім браць прыклад са сваіх баранавіцкіх калег. Глядзіш, і ў нас гульня наладзіцца.

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**
**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у пачатку снежня 2003 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 20-57-41 да 30.11.03.**

ПРЭС-РЭЛІЗ

# АПОШНЯЯ ВОСЕНЬ «ВЯСНЫ»

## АПЕРАЦЫЯЙ ПА ВЫЗВАЛЕННІ БУДЫНКУ ВЯРХОЎНАГА СУДУ КІРАВАЎ ГЕНЕРАЛ

28 КАСТРЫЧНІКА 2003 ГОДУ ЗАВЯРШЫЎСЯ ПРАЦЭС ЛІКВІДАЦЫІ ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ "ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР "ВЯСНА".

У судовым працэсе ўсе прэтэнзіі Міністэрства юстыцыі былі адхіленыя судом як беспадстаўныя і ўсё ж "Вясна" была зліквідаваная, зліквідаваная па выразна палітычнай фармулёўцы "за грубыя парушэнні беларускага заканадаўства падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2001г.".

Сябры ПЦ "Вясна", абураныя несправядлівым рашэннем Вярхоўнага суду ў знак пратэсту з крыкамі "Ганьба!" і "Вясна!" выйшлі на сярэдзіну судовай залі і ўселіся на падлогу.

Суддзя, дачытаўшы рашэнне, пакінула залю. Было 14:45. З гэтага часу пачалася акцыя пратэсту, якая працягвалася да 17:30. Паступова прысутныя грамадзяне і карэспандэнты былі выціснутыя на вуліцу.

Калі сцямнела, супрацоўнікі 1-й роты АМАПу ў цывільным выдалілі ўдзельнікаў акцыі з будынку Вярхоўнага суду. Іх надзейныя рукі з 3-га паверху будынку праз унутраны дворык вынеслі затрыманых і ўладкавалі ў аўтобус, напоўнены АМАПаўцамі.

Калі апошні затрыманы быў уладкаваны ў аўтобус, па міліцэйскай рацыі пачулася: "Всем 02 отбой!", а хтосьці ў аўтобусе сказаў: "Можаце ганарыцца – аперацыяй кіраваў генерал".

8 затрыманых даставілі ў РАУС Ленінскага раёну, дзе на кожнага склалі пратаколы па Арт.166 Адміністрацыйнага Кодэксу – "Непадпарадкаванне законным патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі", знялі адбіткі пальцаў, а таксама зрабілі здымкі з апісаннем знешняга выгляду дзеля картатэкі ў анфас і профіль.

Праз 3 гадзіны ўсе ўдзельнікі акцыі пратэсту атрымалі позвы ў суд і былі адпушчаныя да суду.

На наступны дзень рашэннем Ленінскага суду г. Менску кіраўнік праваабарончага цэнтру Алесь Бяляцкі, а таксама сябры гэтай арганізацыі Валянцін Стэфановіч, Алег Жлутка, Уладзімір Вялічкін, Мікола Лемяноўскі, Зміцер Салаўёў і Аляксей Колчын атрымалі па 5 базавых вялічынь штрафу. Уладзімер жа Лабковіч – 10 базавых вялічынь, таму што, па яго словах, не разумеў па расейску.



**Алесь Бяляцкі, кіраўнік ПЦ «Вясна», ляжыць на падлозе ў залі пасяджэнняў Вярхоўнага суду. Фота: ByMedia.**

**P.S. Тое, што зараз адбываецца з няўрадавымі арганізацыямі можна назваць "зачысткай" 3-га сектару напярэдадні чарговых выбараў – зачыняюцца практычна ўсе арганізацыі, якія прымалі актыўны ўдзел у назіранні, ці ажыццяўлялі дапамогу насельніцтву на практыцы.**

**Уладзімір ВЯЛІЧКІН,**
**былы Старшыня Берасцейскага аддзялення ГА "Праваабарончы цэнтр "Вясна".**



**8 супрацоўнікаў ПЦ «Вясна» сядзяць на падлозе ў залі пасяджэнняў Вярхоўнага суду, пратэстуючы супраць ліквідацыі сваёй арганізацыі. Фота: ByMedia.**

**Ад рэдакцыі:**
**Адвёўшы 2 старонкі тэме ліквідацыі «Вясны» мы не ставім на мэце запалохаць берасцейскую моладзь магчымымі непрыемнымі наступствамі іх актыўнага ўдзелу ў дэмакратычным руху. Мы проста хочам, каб усе ведалі, у якой краіне мы сёння жывем.**

# ВЫНІК ЁСЦЬ!

ЧАРГОВАЯ НАРАДА МОЛАДЗЕВЫХ НДА БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ, ШТО АДБЫЛАСЯ 10 ЛІСТАПАДА Ў БАМГА "СУЗОР'Е", ЗАВЯРШЫЛАСЯ ПАГАДНЕННЕМ АБ ПРАВЯДЗЕННІ КАМПАНІІ "ЗА ЦЁПЛЫ ДОМ".

Кампанія мае часовы характар і ставіць на мэце не толькі павышэнне грамадзянскай актыўнасці і прыцягненне ў арганізацыі новай моладзі, але і павышэнне іміджу моладзевых НДА праз канкрэтныя справы. Першай з іх павінна стаць акцыя па прыцягненню ўвагі грамадства да праблемы камунальных плацяжоў.

Будуць наладжаны зборы подпісаў пад патрабаваннем мараторыя на падвышэнне тарыфаў (подпісы з усёй вобласці будуць накіроўвацца ў аблвыканкам), а таксама пошук тых дамоў, дзе не выконваецца тэмпературны рэжым і жыхары якіх аплочваюць віртуальныя паслугі па абаграванню зямлі, вуліцы і чаго заўгодна акрамя ўласных кватэраў. Плануецца накіроўваць заявы жыхароў праблемных дамоў у ЖЭСы з патрабаваннямі падвысіць тэмпературу ў кватэрах і зрабіць пераразлікі за недапастаўленыя гігакалорыі цяпла.


Будзьма разам – каб не выграбаць снег з-пад батарэяў! Фота ByMedia

Па словах аўтараў "камунальнай ідэі", прадстаўнікоў Цэнтра рэгіянальнага супрацоўніцтва (г. Белаазёрск), такая неўласцівая для моладзевых НДА справа тым не менш павінна не толькі спрыяць фарміраванню станоўчага іміджу моладзевых НДА як дзейснага сродка вырашэння праблем, але і дазволіць павялічыць шэрагі арганізацый-удзельніц за кошт моладзі, якая неабыякава ставіцца да праблем сваіх сем'яў.

Створана працоўная група па планаванню кампаніі "За цёплы дом". Праект кампаніі павінен быць зацверджаны напрацягу месяца. А яго рэалізацыя пачнецца якраз у самы гарачы час – у студзені 2004г. – калі людзі адчуюць увесь клопат сучасных уладаў пра дабрабыт простага чалавека.

Па словах ініцыятараў пагаднення станоўчы досвед супрацоўніцтва, атрыманы падчас кампаніі, можа стаць тым падмуркам, на якім будзе магчыма пабудова эфектыўна дзеючай кааліцыі моладзевых НДА Берасцейскай вобласці.

Застаецца дадаць, што пагадненне "За цёплы дом" адкрыта для ўваходжання ўсіх моладзевых НДА дэмакратычнай накіраванасці. Усе жадаючыя далучыцца да яго дзейнасці могуць тэлефанаваць: (0162) 47-55-69 (Кацярына).

**Dzedzich week-news**

# «БЕЛОРУССКИЙ НАРОД БУДЕТ ЖИТЬ БЕДНО, НО НЕДОЛГО» (А. ЛУКАШЭНКА)

АБ ТЫМ, ШТО АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗБІРАЕЦЦА БАЛАТАВАЦЦА НА ТРЭЦІ ТЭРМІН, НЕ КАЖА СЁННЯ ТОЛЬКІ ЛЯНІВЫ. І ХАЦЯ САМ ЛУКАШЭНКА ДАГЭТУЛЬ АДКРЫТА НЕ ЗАЯВІЎ АБ СВАІМ НАМЕРЫ ЗАСТАЦЦА ПРЫ ЎЛАДЗЕ ЯШЧЭ НА АДЗІН ТЭРМІН, УСІМ ВЯДОМА, ШТО ЗА ІМ СПРАВА НЕ СТАНЕ, А ЎЖО «ПРЫБЛІЖАНЫЯ ДА ЦЕЛА» ПРЫКЛАДУЦЬ УСЕ НАМАГАННІ, КАБ ЗДЗЕЙСНІЦЬ ГЭТАЕ ЖАДАННЕ. ВОСЬ, НАПРЫКЛАД, ПРАФСАЮЗНЫ БОС КОЗІК СКАЗАЎ, ШТО ГАТОВЫ ВЫДВІГАЦЬ ЛУКАШЭНКУ ХОЦЬ НА ТРЭЦІ, ХОЦЬ НА ПЯТЫ ТЭРМІН... МЫ ПРАПАНУЕМ ВАМ (І ПАДОБНЫМ «КОЗІКАМ» ТАКСАМА) УЗГАДАЦЬ, ШТО Ж НАМ АБЯЦАЎ КАНДЫДАТ У ПРЭЗІДЭНТЫ АЛЯКСАНДР РЫГОРАВІЧ ЛУКАШЭНКА Ў 1994 ГОДЗЕ, КАЛІ БАЛАТАВАЎСЯ ЎПЕРШЫНЮ?

«Беларусы! Я освободился от прошлого безвозвратно, и порука тому – эта моя исповедь перед вами. Но я зову вас в будущее и предлагаю вам не социализм и не капитализм, а третий путь вперед – к порядку, достатку и справедливости.

Как кандидат в Президенты я вам гарантирую и обещаю:

– немедленное изгнание из структур власти и управления всех, кому не по пути со мной;

– возвращение награбленного "мафией" народу. Все неправедно нажитые богатства я буду перераспределять сам лично;

– дать работу, бесплатное лечение на европейском уровне, образование – какое кто пожелает;




– цены и инфляция будут одновременно уменьшаться, а зарплата и пенсии так же одновременно расти до мирового уровня, что бы ни говорили о невозможности этого все экономисты, банкиры вместе взятые;

– общих слов уже не будет – только реализация уже разработанных правительством программ адресной помощи всем нуждающимся;

– компенсацию утраченных денежных вкладов населения по курсу рубля к доллару за 1985 год».

**Из предвыборной платформы кандидата в президенты от лучшей части народа (Александр Лукашенко, "Беларуская маладзёжная", №10(36), 1994 г.)**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ЗНАЁМЦЕСЯ – "КРАПІВА"

Чатыры гады дзейнічае ў Берасці грамадская ініцыятыва "Крапіва", а мы, шаноўныя чытачы, даведаліся пра яе толькі ўвесну, дзякуючы фестывалю "Брэмін-2003". А сёння знаёмім з "Крапівай" вас.

"Крапіва" – даволі вузкаспецыялізаваная ініцыятыва. Сфера яе дзейнасці – даследаванні фартыфікацыйных аб'ектаў. Галоўная спецыялізацыя – доты 62-га Брэст-Літоўскага ўмацаванага раёна. Аказваецца і ў такой сферы, дзе, здавалася б, усё даўно вывучана і сістэматызавана, можна рабіць адкрыцці. Так, па словах галоўнага фартыфікатара "Крапівы" Вадзіма Шораха, лісты берасцейскай кнігі "Памяць", што прысвечаны абароне дотаў 22 чэрвеня 1941г. можна выкідаць у сметніцу.

– Тое, што там напісана, адбывацца фізічна не магло, – заяўляе Вадзім Шорах.

А для тых, хто жадае аспрэчыць такія смелыя выказванні берасцейскіх энтузіястаў, для тых, каму падабаецца вывучаць цёмныя і сырыя бетонныя пабудовы, паведамляем, што за кантактамі моладзевай ініцыятывы "Крапіва" вы можаце звярнуцца ў БАМГА "Сузор'е".

**Dzedzich week-news**

### ДЗЯДЫ Ў БЕРАСЦІ

2 лістапада Беларусь адзначала Дзяды – дзень памяці продкаў.

У Берасці гэты дзень быў адзначаны дзвюма падзеямі. Першая адбылася у $16^{00}$ у мікраараёне Рэчыца на могілках жаўнераў войска генерала С.Булак-Балаховіча, якія змагаліся за незалежнасць Беларусі ў 1919-21гг. Сябры Партыі БНФ усклалі кветкі да памятнага знака, што летась быў усталяваны намаганнямі дэмакратычнай грамадскасці.



Другая імпрэза, што пачалася праз гадзіну ля помніка А. Міцкевічу сабрала ў асноўным прадстаўнікоў моладзевых арганізацый горада (Гісторыка, моладзь КХП-БНФ, Малады Фронт, Сузор'е).

Ініцыятары акцыі, сябры МГА "Гісторыка" правялі чытанні ўрыўкаў з міцкевічавых "Дзядоў", сказалі колькі словаў пра яго жыццё і пакручасты лёс, што прымусіў Адама Міцкевіча большую частку жыцця правесці па-за межамі сваёй радзімы, запалілі свечкі ў гонар нашага славутага суайчынніка.

Удзельнікі сходаў з жалем адзначылі, што колькасць людзей, якія не забываюцца скласці даніну памяці сваім продкам у гэты дзень, не павялічваецца, і мала каго зараз прываблівоюць ідэі адраджэння гістарычнай памяці беларусаў. Адзіны шлях вырашэння гэтай праблемы, на думку выступоўцаў, – змена палітычнага ладу ў краіне і павышэнне дабрабыту яе жыхароў.

**Dzedzich week-news**

# СЛУЧАЙНЫЙ ПРЕЗИДЕНТ,

## ИЛИ ЗАКОНОМЕРНОСТИ СМУТНЫХ ВРЕМЕН

УЖЕ САМО НАЗВАНИЕ НОВОГО ПРОИЗВЕДЕНИЯ НАВЕРНЯКА ЗАДЕНЕТ ОФИЦИАЛЬНОГО БЕЛОРУССКОГО ЛИДЕРА — "СЛУЧАЙНЫЙ ПРЕЗИДЕНТ".

Этот труд Павла Шеремета и Светланы Калинкиной — известных журналистов, не относящихся к числу сторонников действующего главы Беларуси, — вышел пятитысячным тиражом в ярославском издательстве "Нюанс". Вступительные статьи написали академик Российской Академии наук Александр Яковлев (его тревожит «знакомое поведение элиты советской выучки, которая вмиг забыла уроки прошлого и вновь готова не только служить, но прислуживать») и лидер Союза правых сил Борис Немцов. Он пишет, что Калинкина и Шеремет произнесли вслух то, о чем многие боятся даже подумать. «Считаю, что людям уже давно пора раскрыть глаза на президента Беларуси... Нам действительно был очень необходим такой откровенный, серьезный, честный и, одновременно, эмоциональный рассказ о последнем диктаторе Европы», – уверен Немцов.

В Москве книга продается пока только на Белорусском вокзале. В ближайшее время будет издан дополнительный тираж.

Академику Александру Яковлеву, кстати, название книги представляется не совсем точным. "Ничего случайного тут нет", — считает он.

Впрочем, один из авторов, Светлана Калинкина, тоже сказала "Белорусским новостям", что считает приход Александра Лукашенко во власть по-своему закономерным:

— Случай в том, что в любой стране раз в несколько столетий складывается ситуация, когда главой государства вдруг может стать, образно говоря, человек с улицы. И название выбрано именно с этой точки зрения.

В принципе эта книга — политическая биография Александра Лукашенко, написанная на основе открытых данных и открытых источников информации. Есть много других данных, которые пока подтвердить не удается.

Реакции на выход книги я пока не чувствую, но надеюсь, что она будет сдержанная.

В 1994г. в Беларуси было действительно смутное время. Народ устал от псевдореформ правительства Вячеслава Кебича (кстати, объединение денежных систем России и Беларуси — еще его идея), а белорусская оппозиция не сумела объединиться для победы на выборах. Фигуру Лукашенко мало кто воспринимал всерьез. И, как показало время, напрасно.

Политолог Валерий Карбалевич:

— Такие значительные события, как избрание первого президента страны, случайностью назвать нельзя. Именно этот период – избрания Александра Лукашенко и его правления – дал урок всему белорусскому обществу. История позволила провести такой эксперимент, и отрицательный результат эксперимента – тоже результат. Сейчас белорусское общество уже может и должно делать выводы из этого опыта. Сторонники иной модели будущего Беларуси должны усвоить этот урок, чтобы не допускать подобного впредь.

Возможно, политическая биография первого белорусского президента, написанная Светланой Калинкиной и Павлом Шереметом,




тоже поможет усвоению этого урока. К слову, точку авторы еще пока не ставят. "Очень многие люди рассказывают о нашем президенте интересные вещи, но не соглашаются записывать разговоры, ссылаться на них. А вообще работать мы продолжаем. И продолжения ждать можно", — сказала Светлана Калинкина.

**БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ**

**P.S. «Книгу «Случайный президент» можно прочитать в редакции «Дзедзіча».**

# БОЛЬШОЙ БРАТ БУДЕТ ВИДЕТЬ ТЕБЯ

РЕСПУБЛИКАНСКОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ "БЕЛТЕЛЕКОМ" ГОТОВИТСЯ РЕАЛИЗОВАТЬ ПРОЕКТ ПО ВНЕДРЕНИЮ АВТОМАТИЗИРОВАННОЙ СИСТЕМЫ ЦЕНТРАЛИЗОВАННОГО СБОРА И ОБРАБОТКИ ТРАФИКА.

Проще говоря, провайдер-монополист и ведущий телефонный оператор будет создавать систему по отслеживанию и хранению всей информации, проходящей через его сеть.

Про хранение информации сайт «Белтетекома» сообщает, что «за последние годы заметно возросло число объектов, с которых необходимо собирать данные в единое хранилище с последующей обработкой для обеспечения централизованных расчетов с другими операторами связи. При этом неизменно важным остается качество и достоверность исходных данных, возможность оперативного реагирования на любой информационный запрос по трафику и сохранения гибкости отношений с партнерами».

Официально этот проект «рассматривается как связующее звено между предоставлением услуг и получением оплаты за них. Реализация проекта позволит решить проблемы, вызванные многообразием коммутационного оборудования, установленного на сетях РО "Белтелеком", различиями в способах сбора и форматах предоставляемых данных первичного учета трафика, значительными объемами самих данных учета трафика».

Понятно, что внимание не акцентируется на том, что новая аппаратура позволяет учитывать не только объемы передаваемой через интернет и телефонную связь информации, но и ее содержание. А хранилище информации позволит создавать досье на любого человека, который пользуется телефоном или интернетом.

**БЕЛАПАН (www.naviny.by)**

# ОТКРЫЛСЯ НОВЫЙ САЙТ ПРО БЕЛАРУСЬ

Белорусско-литовский информационно-аналитический портал BelarusFree.org – проект Института Беларуси в Литве – начал свою работу.

Как сообщил пользователям портала руководитель проекта, известный белорусский писатель и предприниматель Евгений Будинас, это ежедневное сетевое общественно-политическое издание "общедемократической направленности, ставящее своей задачей распространение объективной информации о Беларуси в мире и о мире в Беларуси, а также пропаганду общечеловеческих и демократических ценностей в Беларуси и для Беларуси".

Институт Беларуси в Литве — некоммерческая неправительственная организация, созданная по инициативе граждан и научно-исследовательских учреждений Литвы и Беларуси "с целью сближения народов обоих государств ради демократизации белорусского общества и вовлечения белорусского государства в общеевропейский интеграционный процесс".

**БЕЛАПАН**

## ДАРЭЧЫ

Горш за ўсіх прыходзіцца прагramістам з Microsoft!

Ім, небаракам, у выпадку чаго і аблаяць няма каго...

***

Кнігі робяць чалавека разумным, а газеты – нервовым.

***

Гісторыя з жыцця адной палескай вёскі.

Выходзіць мужык на ганак. Глядзіць, у бабы Мані з трубы дым ідзе. Мужык думае:

– Для сняданка позна, для абеда рана. Самагон, значыць, гоніць! Пайду пахмялюся!

Заходзіць да яе, а яна сапраўды самагон гоніць. І кажа яму:

– Я пайду парсюкоў накармлю, а ты сачы, як толькі вада скончыцца, схадзі на калодзеж і прынясі яшчэ вады. Першыя кроплі з'явяцца, можаш узяць.

Як толькі вада скончылася, мужык узяў вёдры і пайшоў на калодзеж. А тым часам побач два мента праходзілі. Глядзяць, у бабы Мані з трубы дым ідзе. Ну яны і думаюць:

– Для сняданка позна, для абеда рана. Самагон, значыць, гоніць! Вось хто ўсю вёску спойвае!

Зайшлі яны ў дом, глядзяць, самагон гатуецца, але нікога няма. Вырашылі пачакаць. І тут мужык заходзіць з поўнымі вёдрамі вады. Яны яго схапілі, прывялі ў аддзел і прымусілі тлумачальную пісаць. ¨н і напісаў:

– Выходжу я на ганак. Гляджу, у бабы Мані з трубы дым ідзе. Думаю, ну ўсё, пажар, пабег за вадой. Прыбягаю да яе, дзверы адчыняю, гляджу, а там два мента самагон гатуюць.

# УМЕР ОСНОВАТЕЛЬ "ГРИНПИС"

4 ОКТЯБРЯ 2003 ГОДА В ВОЗРАСТЕ 83 ЛЕТ В СВОЕМ ДОМЕ ОТ СЕРДЕЧНОГО ПРИСТУПА СКОНЧАЛСЯ БЕН МЭТКАФ – ВЕТЕРАН БРИТАНСКИХ ВВС, ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЙ ЖУРНАЛИСТ И СПЕЦИАЛИСТ ПО СВЯЗЯМ С ОБЩЕСТВЕННОСТЬЮ, ОДИН ИЗ ОСНОВАТЕЛЕЙ МЕЖДУНАРОДНОЙ ЭКОЛОГИЧЕСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ "ГРИНПИС".



**Участники акции Гринпис на Амчатке (Бен Меткаф - в верхнем ряду четвертый слева)**

Бен Мэткаф (Ben Metcalfe) родился в 1920 г. в Виннипеге (Канада) и с ранних лет хотел летать. Подростком он покинул дом и отправился бродяжничать, причем в поисках приключений добрался аж до Англии. В 16 лет Бен вступил в Королевские военно-воздушные силы. Его отправили служить авиастрелком в Индию. Мэткаф проникся философией Ганди гораздо больше, чем английские генералы, поэтому он и его пилот всегда сбрасывали бомбы в пустые поля, а не на индийские деревни, как приказывало командование. Во время Второй мировой британец служил в Африке, где в 1942 г. участвовал в битве с фашистскими войсками при Эль Аламейне. После войны он работал во Франции журналистом, а в 1951 году вернулся на родину и устроился репортером в издание Winnipeg Free Press. Затем переехал в Ванкувер, где работал в газете Province и на CBC. В 1960-х он со своей второй женой Дороти основал компанию по связям с общественностью.

В 1969 г. Мэткаф впервые столкнулся с проблемами экологии. Его фирму нанял предприниматель, желающий основать Экологический музей в пригороде Ванкувера. Мэткаф создал серию рекламных плакатов под девизом "Экология? Оглянись, ты ее часть". Успех был потрясающим, и с тех пор Бен Мэткаф занимался исключительно PR-кампаниями, касающимися окружающей среды.

В 1969 году США провели ядерное испытание на крохотном островке Амчатка рядом с Аляской. Этот взрыв вызвал настоящее землетрясение. К счастью, никто не пострадал, но многие были напуганы, так как во время аналогичного испытания в 1964г. из-за искусственного землетрясения погибло 115 жителей Аляски, а образовавшаяся в океане волна достигла пляжей далекой Японии. Мэткаф стал координатором компании "Не гони волну!", цель которой - предотвратить следующий взрыв ядерной бомбы на Амчатке, намеченный правительством на 1971 год.

Когда мирные демонстрации не дали никакого результата, 12 активистов экологических протестов организовали комитет под названием "Гринпис" (Greenpeace - "Зеленый мир"). 10 из них, в том числе и канадский журналист, сели в лодку и отправились к Амчатке. По их задумке, власти должны были отменить взрыв, чтобы не утопить волной экологов, находившихся в маленькой лодке в открытом океане. Взрыв был отменен по не зависящим от экологов причинам, вторая попытка также окончилась неудачей, однако эта история сразу сделала Мэткафа и "Гринпис" знаменитыми.

В 1972 году Мэткаф отправляется к атоллу Муруроа в Южной Атлантике, чтобы подобным же образом остановить французские атомные испытания. Для этого он нанимает корабль "Вега", принадлежащий Дэвиду МакТаггарту, первоначально не подозревавшему о целях плавания. Однако МакТаггарт затем настолько проникся идеями "Гринпис", что принял активное участие в экологической работе и даже стал президентом организации. Впоследствии уже МакТаггарта стали называть основателем "Гринписа". Он погиб в автокатастрофе весной 2001 года.

Вскоре после плавания к Муруроа Мэткаф покинул "Гринпис", однако будучи профессионалом в области PR успел к этому моменту сделать достаточно, чтобы "Зеленый мир" прославился во всем мире и стал по-настоящему международным движением. Последние годы Бен Мэткаф жил в Канаде недалеко от города Виктория в частном доме на берегу озера вместе со второй женой Дороти, с которой развелся, однако сохранил близкие отношения. Он пережил своих сыновей – Кристофер погиб в 1980 г., а Мишель умер в 2001-м. Дочь эколога от второго брака Мишель живет в Канаде, а дочери от первого брака Шарлотта и Софи – во Франции. Основанная им организация насчитывает 2,5 миллиона активистов в 27 странах мира.

**Дзмітрый ШАСТАК**

# ИНТЕРНЕТ В ОБМЕН НА ЭРОТИКУ

УПРАВЛЕНИЕМ СЛЕДСТВЕННОГО КОМИТЕТА ПО МИНСКОЙ ОБЛАСТИ ВОЗБУЖДЕНО УГОЛОВНОЕ ДЕЛО В ОТНОШЕНИИ ИЗОБРЕТАТЕЛЬНОГО КОМПЬЮТЕРНОГО МОШЕННИКА, КОТОРЫЙ ОХОТИЛСЯ ЗА ЧУЖИМИ ПАРОЛЯМИ ДЛЯ ДОСТУПА В ИНТЕРНЕТ. С ПОМОЩЬЮ НЕСЛОЖНОЙ ПРОГРАММЫ ТИПА "ТРОЯНСКИЙ КОНЬ" И ИЗОБРЕТАТЕЛЬНОСТИ ПОДОЗРЕВАЕМЫЙ СУМЕЛ ОБМАНУТЬ СОТНИ, ЕСЛИ НЕ ТЫСЯЧИ ПОЛЬЗОВАТЕЛЕЙ ГЛОБАЛЬНОЙ СЕТИ.



“Привет, Саша! Мне 23 года, рост 172, привлекательная, стройная, а вообще — лучше меня хотя бы один раз увидеть", — так начиналось письмо, полученное клиентами почтового сервера tut.by якобы из-за сбоя работы почтового робота. Обращаясь к молодому человеку, с которым она познакомилась через Сеть, некая девушка, выпускница финансово-экономического колледжа, сообщала, что она поддерживает предложение обменяться эротическими фотографиями. В ответ на весьма откровенные снимки таинственного Саши она посылала свои.

Мало кто из получателей этого письма отказывался взглянуть на снимки любительницы виртуальных знакомств, адресованные постороннему человеку и попавшие в почтовый ящик по ошибке. Однако заархивированные фотографии почему-то не открывались. Только позже выяснялось: на память о себе девушка оставляла вирус. Несложная компьютерная программа типа "троянский конь" открывала пароль доступа в глобальную сеть каждого, кто пытался открыть чужое письмо. Используя полученную незаконным путем информацию, распространитель вируса получал возможность пользоваться услугами провайдеров интернета за чужой счет.

О досадном обмане заговорили на интернет-форумах, и довольно скоро "заразные" сообщения заинтересовали сотрудников управления по раскрытию преступлений в сфере высоких технологий МВД. Компьютерная разведка этой службы, которая, как выяснилось, не оставляет без внимания чаты, вычислила IP-адрес, с которого производилась рассылка письма с файлом sexyfoto.exe. Вскоре стало известно имя его автора. "Девушкой" оказался 25-летний минчанин, некий Александр Л. Весной он произвел около 2 тыс. рассылок "троянского коня" под видом письма с эротическими фотографиями.

По результатам проверки в отношении этого человека следствие возбудило уголовное дело по ст. 354 — "разработка, использование либо распространение вредоносных программ". В настоящее время по делу назначены экспертизы, которые оценят масштабы действий подозреваемого и количество потерпевших от рассылки "эротического" письма. Последние, впрочем, не торопятся заявлять претензии автору виртуального розыгрыша. По предварительным данным, жертвами обмана стали довольно крупные белорусские компании, которые на протяжении некоторого времени, сами о том не подозревая, оплачивали Александру Л. пользование интернетом. Простейшая программа не была вовремя обнаружена службами безопасности. О происшествии любители чужих писем узнали от сотрудников милиции уже после возбуждения уголовного дела.

Следствие в настоящее время только начато, и оценка деятельности подозреваемого в рассылке "троянского коня" пока не дана. Однако, по некоторым данным, эротическое письмо — не единственный способ обмана, которым пользовался Александр.

**БЕЛАПАН (www.naviny.by)**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 14 ЛІСТАПАДА

У беларускай вёсцы Крошын 14 лістапада 1812г. нарадзіўся хлопчык, якога звалі **Паўлюк Багрым**. Гаротнае жыццё прыгоннага, рэкрутчына ў глыбіні Расеі – такі лёс напаткаў Паэта. Багрым варты гэтага звання, хоць вядома, што яго творчую спадчыну склалі толькі тры вучнёўскія сшыткі, якія зніклі без знаку пры арышце. Можа гэта былі вершы пра каханне, пра прыгажосць роднай зямлі. Захаваўся толькі адзін Багрымаў верш “Зайграй, зайграй, хлопча малы...“, напісаны ім у 15-гадовым узросце. Верш гэты прысвечаны Крошынскаму паўстанню 1828 г. Думкі і пачуцці прыгоннага падлетка, скіраваныя ў бок пошукаў выйсця з безвыходнага становішча, вызначаюцца адчаем і бездапаможнасцю. Падлетак гатовы абярнуцца ў ваўкалака, нарадзіцца каршуном — тады яго ў “паншчыну б не пагналі, у рэкруты б не забралі і ў маскалі не аддалі“. Вярнуўшыся на Бацькаўшчыну, Багрым ужо не наважваўся брацца за пяро. ¨н працаваў у Крошыне кавалём. І адмысловым кавалём! Дасёння ў Крошынскім касцёле вісіць вялікая жырандоля, па-мастацку скаваная самім Паўлюком Багрымам. Верш і жырандоля – для некага можа і не значная, але такая вялікая і дарагая для шчырых беларусаў спадчына.

14 лістапада, толькі ўжо 1918 г., нарадзіўся яшчэ адзін хлопчык-беларус – **Паўлік Марозаў.** Як сведчыць гісторыя, Паўлік быў сапраўдным піянерам, бо выдаў ЧК свайго бацьку, старшыню калгаса, што, як мог, дапамагаў сваім аднавяскоўцам, якія не жадалі ўступаць у калгас і адпраўляцца на выгнанне. Бацьку, Трафіма Марозава, расстралялі, а Паўлікаў дзядуля забіў унучка-здрадніка. Доўгія гады савецкім дзецям прышчаплялі ідэал паводзінаў сапраўднага піянера Паўліка Марозава. Некаторым прышчапілі. Але, відаць, не ўсім. Былі і такія дзеці, якія болей любілі беларускія чытанкі, а не крывавыя гісторыі пра класавую барацьбу. І такіх дзяцей заўсёды большасць, а значыць, усё ў нас будзе добра.

### 17 ЛІСТАПАДА

Сёння ў свеце адзначаюць **Міжнародны дзень студэнтаў.** Устаноўлены ён быў у 1946 г. на Сусветным кангрэсе студэнтаў, што адбыўся тады ў Празе, ў гонар чэшскіх студэнтаў-патрыётаў, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі 17 лістапада 1939 г.

### 13 ЛІСТАПАДА

13 лістапада 1730 г. нарадзіўся расейскі генералісімус **Аляксандр Сувораў**. Той самы, які праславіўся сваімі пераходамі цераз Альпы і дасягненнямі ў галіне вайсковай навукі. Той самы, што выступіў кіраўніком захопу і далучэння беларускіх земляў да Расейскай імперыі ў часе падзелу Рэчы Паспалітай. Найбуйнейшай перамогай Суворава ў той кампаніі стала бітва пад Сталавічамі каля Баранавічаў, дзе расейцы разбілі корпус Міхала Казіміра Агінскага. Калі ж у краі пачалося антырасейскае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, задушэннем вызваленчага войска зноў кіраваў Сувораў. У бітвах 1794 г. на яго чале пад Крупчыцамі і Берасцем расейцы разбілі корпус генерала Серакоўскага. У гонар Суворава за савецкімі часамі ў Кобрыне быў адчынены ваенна-гістарычны музей, які датрываў да нашага часу. Кажуць, ёсць там і стэнды, прысвечаныя Касцюшку, а кожная экскурсія ператвараецца ў слоўную вайну. Музей Суворава ў Беларусі – такая самая недарэчнасць, як музей Гітлера, бо ў такім музеі ўшаноўваецца памяць акупанта.

# ХТО ЗНІШЧЫЎ

## ЛІНГВАЦЫД

НІ ДЛЯ КАГО НЕ САКРЭТ, ШТО САЦЫЯЛЬНЫЯ ФУНКЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ СЕННЯ, МЯККА КАЖУЧЫ, ВЕЛЬМІ АБМЕЖАВАНЫЯ. БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ДЗЯРЖАЎНАЯ МОВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, НЕ ДАПУСКАЕЦЦА Ў ВОЙСКА (НАВАТ ПРЫСЯГУ БЕЛАРУСКІЯ ХЛОПЦЫ ПРЫМАЮЦЬ ПА-РАСЕЙСКУ), У БЕЛАРУСКІХ КРАМАХ НЕ ЎБАЧЫШ ЦЭННІКАЎ НА МОВЕ ТЫТУЛЬНАЙ НАЦЫІ, ВА ЎСЕЙ КРАІНЕ НЯМА НІВОДНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ, У БУЙНЫХ ГАРАДАХ БАЦЬКІ НЕ МОГУЦЬ ДАЦЬ СВАІМ ДЗЕЦЯМ БЕЛАРУСКУЮ АДУКАЦЫЮ, НАВАТ СЯРЭДНЮЮ, БО АМАЛЬ НЕ ЗАСТАЛОСЯ ТАМ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ КЛАСАЎ.

**(Працяг. Пачатак у № 5.)**

У першыя гады Савецкай улады пад уплывам ідэй дзеячаў БНР пачынаецца беларусізацыя – працэс нацыянальна-культурнага адраджэння, дзякуючы якому беларуская мова стала пануючай ва ўсіх сферах грамадскага жыцця (ад газет і навучальных устаноў да ЦК КП(б)Б), беларусы складалі большасць у дзяржаўных органах улады. Яшчэ ў 1938г., у зусім іншых палітычных умовах, з агульнай колькасці 199 газет на беларускай мове выходзіла 149 (75%), у 1940г. агульны наклад выдадзеных кніг склаў 10370 тысяч асобнікаў, з іх на беларускай мове – 7748 тыс (75%) – гэта вынік дзейнасці беларускіх патрыётаў-адраджэнцаў.

На жаль, вельмі значны ў беларускай гісторыі перыяд беларусізацыі скончыўся ўжо ў канцы 1920-х гг., а яму на змену прыйшлі жахлівыя рэпрэсіі, барацьба з "нацыянал-дэмакратызмам" і татальная русіфікацыя. У ходзе сталінскіх рэпрэсій арыштавана каля 90% беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, большасць з якіх была потым фізічна знішчана. З 328 арыштаваных пісьменнікаў дажылі да смерці Сталіна ў сакавіку 1953г. усяго 20 чалавек. Беларуская Акадэмія навук страціла больш за 90% сваіх супрацоўнікаў.

Камуністычная партыя пачала наступ на адметнасці беларускай мовы. 26 жніўня 1933г. быў прыняты дэкрэт СНК БССР "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапіса". Ва ўступе да яго гаварылася, што "нацыянал-дэмакратызм (г.зн. нацыянальна арыентаваная плынь беларускай інтэлігенцыі – Д.Ш.) імкнуўся ўсімі мерамі і спосабамі адарваць беларускую літаратурную мову ад мовы шырокіх беларускіх працоўных мас, стварыў штучны бар'ер паміж беларускай і рускай мовамі і засмечваў беларускую мову рознымі сярэдневяковымі архаізмамі і буржуазнымі вульгарызмамі".

Дэкрэтам паўсюдна ўводзілася "наркамаўка" (ад слова наркамат – народны камісарыят, г.зн. адпаведнік міністэрства асветы – Д.Ш.) – форма беларускай мовы, механічна набліжаная да расейскай. Пры дапамозе жыварэзання мовы спрабавалі зрабіць з беларускай мовы бляклую копію расейскай. Копія, як вядома, заўсёды горшая за арыгінал, а таму ад яе адмаўляюцца. Згодна з рэформай правапіса 1933г. у беларускую мову было ўведзена каля 30 фанетычных і марфалагічных асаблівасцяў, чужых нашай мове. Паступова пачаў уводзіцца расейскі слоўнікавы матэрыял. Так, напрыклад, калі "Расейска-беларускі слоўнік" С Некрашэвіча і М. Байкова (1928г.) для перакладу расейскага слова *государство* прапаноўваў сінонімы *дзяржава, гаспадарства, панства,* то "Расейска-беларускі слоўнік" А. Александровіча (1937г.) – толькі *дзяржава,* тым жа словам перакладалася і расейскае *держава*. Эквівалентам расейскага *город* у першым слоўніку былі *места, горад,* а ў другім – толькі *горад, дефект* перакладаўся ў 1928г. сінонімамі *дэфект, брак, загана,* а ў 1937г. – толькі словам *дэфект.* Такое **спрашчэнне** рабілася для таго, каб потым можна было казаць пра беднасць і неразвітасць беларускай мовы, што мы і маем магчымасць чуць нават у нашы дні.

Яскравы прыклад "навуковага збліжэння" дзвюх моў – перайменаванне на расейскі манер нашай сталіцы – Менска. Аргументам на карысць ідэнтычнага расейскаму напісання назвы галоўнага горада БССР як "Мінск", а не "Менск" (шырока вядомага па помніках і ў народнай мове) было тое, што *"гэта імя адной з рэспубліканскіх сталіц "нашай краіны", і яно ўсюды павінна пісацца аднолькава".* Тая ж аргументацыя выкарыстоўвалася ў якасці "навуковай", як відаць з пратакола пасяджэння Інстытута мовазнаўства Беларускай Акадэміі навук ад 18 лютага 1931г.: *"Зыходзячы з таго, што ўся працоўная Беларусь, а таксама суседнія рэспублікі ведаюць і ўжываюць тэрмін Мінск, а толькі нязначная частка Міншчыны гаворыць Менск, – тэрмін Менск, уведзены нацдэмамі, заменіць агульнавядомым Мінск".*

Вялікую "навуковую вартасць" маюць службовыя дописы першага сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі Сталіну. Так, напрыклад, заўважалася імкненне давесці, што кожная спроба перадаць "святыя" для савецкіх людзей словы арыгінальнымі сродкамі беларускай мовы вядзе да іх прафанацыі і дыскрэдытацыі: *"Лозунг "Да здравствует годовщина Октябрьской революции!" на белорусском языке "Няхай жыве гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі!" испохаблен от начала до конца. Белорусы говорят здравствуй, а няхай означает пусть, в смысле пренебрежительного так и быть. Гадавіна означает гада большого размера. Так и говорят: "Ух, якая гадавіна". Кастрычнік – октябрь. Но кастрица – не лён, а отбросы от льна".*

Наступны крок русіфікацыі ў Беларусі пры савецкай уладзе – пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 13 сакавіка 1938г. "Аб абавязковым вывучэнні расейскай мовы ў школах нацыянальных рэспублік і абласцей". З гэтай нагоды Н.К. Крупская піша ліст І. Сталіну: *"Мы ўводзім абавязковае вывучэнне рускай мовы ва ўсім СССР. Гэта добра. Гэта дапаможа паглыбленню дружбы народаў. Але мяне вельмі хвалюе, як мы гэта абучэнне будзем праводзіць. Мне здаецца іншы раз, што пачынае паказваць пакрышку рожкі вялікадзяржаўны шавінізм* (падкрэслена мною – Д.Ш.)".

Пасля 2-й Сусветнай вайны першым сур'ёзным ударам па мове было выданне ў красавіку 1951г. загада міністра асветы БССР, у адпаведнасці з якім у расейскамоўных агульнаадукацыйных школах адмяняліся пераводныя экзамены і экзамены на сталасць па беларускай мове. Ад гэтага часу пэўная частка нашых агульнаадукацыйных школ пачала фарміраваць з дзяцей беларускага паходжання нацыянальных нігілістаў. Справа даходзіла да абсурду: выпускнік школы атрымліваў атэстат сталасці і не валодаў мовай, якая з'яўляецца роднай для карэннага насельніцтва БССР.

У снежні 1958г. выходзіць Закон СССР "Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР". Паводле новага закона пытанне аб неабходнасці вывучэння нацыянальнай мовы ў рускіх школах пакідалася на волю саміх вучняў і іх бацькоў. Зра-

# БЕЛАРУСКУЮ МОВУ?

зумела, калі вучням прапанаваць вывучаць на адзін прадмет менш, – без розніцы, матэматыку, альбо беларускую мову, – пераважная большасць з іх будзе "за" абедзвюма рукамі. У красавіку 1959г. сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла адпаведны закон, у якім адзначалася, што навучанне другой мовы праводзіцца "па жаданню вучняў і іх бацькоў". Паколькі ВНУ ў БССР даўно ўжо працавалі на расейскай мове, зразумела, якую мову пры гэтым выбіралі.

Як бачым, у пытаннях беларускай мовы кампартыя за ўвесь перыяд сваёй пасляваеннай дзейнасці з юрыдычнага боку ні ў чым сябе не запляміла, бо не прыняла ніводнага дыскрымінацыйнага акта, адкрыта накіраванага супраць роднага слова карэннага насельніцтва. Дыскрымінацыю беларускай мовы партыя чыніла тым, што афіцыйна не карысталася ёю ў сваёй практычнай дзейнасці, падаючы гэтым прыклад залежным ад яе савецкім, прафсаюзным, адміністрацыйна-гаспадарчым органам.

Імкненні некаторай часткі наменклатуры сур'ёзна ўзяцца за паляпшэнне стану беларускай мовы спыняліся з маскоўскага цэнтру. К. Мазураў, па сутнасці першы беларус на пасадзе кіраўніка КПБ, намагаўся хоць неяк аднавіць беларусізацыю. У студзені 1959г. на святкаванні 40-годдзя БССР ён зрабіў даклад на беларускай мове. У перапынку М. Хрушчоў, які сядзеў у прэзідыуме, пачаў лаяць Мазурава: *"Ни черта не понятно!"*. На прыступках БДУ Хрушчоў выказаўся яшчэ больш выразна: *"Чем быстрее все мы будем разговаривать по-русски, тем быстрее построим коммунизм"*.

З сярэдзіны 1960г. пачынаецца эпідэмія вызвалення ад вывучэння беларускай мовы ў школах. Да сярэдзіны 70-х гг.: у 95-ці гарадах і 117-ці раённых цэнтрах БССР не засталося аніводнай беларускай школы.

У 1985г. у БССР была выдадзена 3431 кніга агульным накладам 53,5 млн. асобнікаў, з іх на беларускай мове – 393 кнігі накладам 5 млн. асобнікаў.

З пачаткам перабудовы праблема беларускай мовы, як і нацыянальнага адраджэння ўвогуле, набыла асабліва актуальнае гучанне, прычым не толькі агульна-культурнае, але і грамадска-палітычнае. 15 снежня 1986г. 28 прадстаўнікоў творчай і навуковай эліты падпісалі ліст на імя Генсека ЦК КПСС М. Гарбачова, які практычна змяшчаў праграму адраджэння беларускай нацыі. Галоўным прадметам заклапочанасці аўтараў ліста з'яўлялася родная мова, якая, як справядліва адзначалася, амаль не ўжывалася ў партыйных, савецкіх і дзяржаўных органах як рабочая мова і мова справаводства. Каб адвесці пагрозу "духоўнага вымірання" беларускага народа, прапаноўвалася праграма мер па карэнным паляпшэнні становішча роднай мовы, культуры і патрыятычнага выхавання.

Пасля таго, як стала зразумелым, што партыйныя ўлады ў рэспубліцы не збіраюцца мяняць сваіх адносін да мовы, 4 чэрвеня 1987г. прадстаўнікі беларускай эліты зрабілі яшчэ адну спробу звярнуцца да М. Гарбачова і накіравалі яму адкрыты ліст са 134 подпісамі ад прадстаўнікоў усіх пластоў грамадства. У ім нацыянальная палітыка савецкіх улад на Беларусі была названа яе сапраўдным імем – русіфікацыя. Але і на гэты раз улады маўкліва праігнаравалі патрабаванні патрыятычнай часткі грамадства.

Толькі 26 студзеня 1990г. быў прыняты Закон аб мовах. У прэамбуле гэтага дакумента адзначалася, што "пад пагрозай апынулася само існаванне беларускай мовы". Згодна з арт. 2 Закона беларуская мова была прызнана адзінай дзяржаўнай мовай.

Пасля кароткатэрміновага перыяда паляпшэння сітуацыі з праблемай адраджэння беларускай мовы, у сярэдзіне 90-х гг. пачаўся этап чарговага наступу на яе пазіцыі ў грамадстве.

Увосень 1994г. пракамуністычны Народны рух Беларусі выйшаў з ініцыятывай правядзення рэферэндума па пытанню надання расейскай мове роўнага статусу з беларускай. Ініцыятыва разглядалася ў 6-ці парламенцкіх камісіях і Міністэрстве юстыцыі і ў выніку ў правядзенні рэферэндума было адмоўлена. Спасылаючыся на арт. 3 Закона аб рэферэндуме, згодна з якім на ўсенароднае галасаванне забаранялася выносіць пытанні, якія "парушаюць неад'емнае права народа Рэспублікі Беларусь на дзяржаўныя гарантыі існавання беларускай нацыянальнай культуры і мовы, Цэнтральная камісія па выбарах і рэферэндумах растлумачыла падаўцам заявы, што пытанне аб наданні расейскай мове дзяржаўнага статуса "прама забаронена заканадаўствам рэспублікі".

Але, як аказалася, quod non licet bovi, licet Jovi!

1 снежня 1994г. прэзідэнт РБ на сесіі Гомельскага гарсавета растлумачыў дэпутатам, чаму ён не гаворыць па-беларуску: *"Люди, которые говорят на беларускай мове, не могут делать ничего, как только говорить на беларускай мове. Потому что на беларускай мове нельзя сказать что-то великое. Беларуская мова – бедная мова. В мире существует только два великих языка – это русский и английский"*. Калі б так аб сваёй мове выказаўся, напрыклад, прэзідэнт Чэхіі, дык сыйсці ў адстаўку для яго заставалася б найлепшым выйсцем. А "усенародна абраны" не толькі не спужаўся ўласных слоў, але і пачаў праводзіць адпаведную палітыку.

14 траўня 1995г. па ініцыятыве прэзідэнта РБ А. Лукашэнкі адбыўся незаконны рэферэндум, адно з пытанняў якога тычылася "ураўнання" у правах расейскай мовы з беларускай. Згодна з вынікамі рэферэндума расейская мова ў РБ набыла статус дзяржаўнай. Дэмакратычнай грамадскасцю вынікі рэферэндума не прызнаныя, бо ў працэсе яго падрыхтоўкі і правядзення быў зафіксаваны шэраг істотных парушэнняў.

Адпаведныя змены былі ўнесены А. Лукашэнкам у Закон аб мовах (13 ліпеня 1998г.). Усё гэта дало магчымасць антыбеларускім сілам спыніць працэс беларусізацыі і адкінуць краіну ў вырашэнні моўнага пытання на некалькі дзесяцігоддзяў назад. Пасля рэферэндума да 1998г. колькасць беларускамоўных школ у Менску скарацілася са 130 да 17, у абласных цэнтрах іх не засталося зусім.

Аналізуючы палітыку лінгвацыду, якую праводзілі і праводзяць сёння ўлады ў Беларусі, можна зрабіць выснову, што антыбеларускія сілы ставяць перад сабой наступныя мэты:

1. Звужэнне да мінімума сацыяльных функцый беларускай мовы;

(Працяг на с. 8)

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 19 ЛІСТАПАДА

Сёння ў свеце адзначаюць вельмі сімпатычнае свята – **Міжнародны дзень вітанняў.** Давайце і мы сёння (і заўсёды) не будзем шкадаваць вітанняў адзін аднаму. Сапраўды, нішто не каштуе нам гэтак танна і нішто не цэніцца гэтак дорага, як узаемаветлівасць.

### 20 ЛІСТАПАДА

20 лістапада 1899 г. нарадзіўся **Міхась Клімковіч**, вядомы тым, што напісаў словы гімна БССР, а таксама тым, што ў другой палове 30-х узначальваў Саюз пісьменнікаў БССР, акурат тады, калі была расстраляная ці высланая ў ГУЛАГ большасць беларускіх літаратараў. Клімковіч адкрыта спрычыняўся да гэтых рэпрэсіяў: пісаў "зубадрабільныя" артыкулы, у якіх звінавачваў сваіх калег у нацдэмаўшчыне.



20 лістапада 1930г. спрабуе скончыць жыццё самагубствам **Янка Купала**. Да гэтага прывялі напады на яго ў друку і допыты ў ГПУ. А найперш, мусіць, тая атмасфера савецкага «шчасця», у якой даўнія сябры і калегі паэта пачалі знікаць сярод ночы. Купалу змушалі сядзець у прэзідыумах і хваліць Сталіна, тады як у краіне былі разгорнутыя масавыя рэпрэсіі. Яшчэ і дагэтуль невядомая прычына смерці паэта ў 1942-м, калі ён упаў у лесвічны пралёт маскоўскага гатэлю. Адна з версіяў кажа, што Купала ўсё ж здзейсніў свой намер самавольна пакінуць жыццё. Аднак пытанне наконт Купалавай смерці і да сёння застаецца адкрытым.

### 26 ЛІСТАПАДА



У гэты дзень, 26 лістапада 1930г. у Воршы нарадзіўся **Уладзімір Караткевіч**, выдатны беларускі празаік і паэт. ¨н, як ніхто іншы, змяніў у XX стагоддзі светапогляд беларусаў. Ягоныя кнігі, кінасцэнары і п'есы сталі падмуркам найноўшага беларускага Адраджэння. Трапна і па-мастацку прыгожа сказаў пра творцу Рыгор Барадулін: "Любая літаратура можа сказаць, што яна багатая і сталая, калі мае свайго Уладзіміра Караткевіча. Ты пісаў як дыхаў. Сваім асабістым прыкладам творцы паказваў узор служэння Радзіме, Народу, Мове. Далёкі ад марнай сумятні, ад дробязных страсцей, з кнігай і шчодрым сэрцам прыйшоў Ты на свет, каб пакінуць свету кнігі свае па-беларуску шчырыя і па-караткевічаўску рамантычна-незамутненыя, ранішнія. Кнігі Твае чыталіся, чытаюцца і будуць чытацца, бо яны напісаныя як бы навырост. Тыя, хто прыйдуць на зямлю ўслед за намі, будуць зайздросціць нам як Тваім сучаснікам, Тваім першачытачам... Праўдзівы Майстра, чысты як сляза, Паэце, Ты ёсць, Ты будзеш! Вечна. Крынічна. Зорна.".

### ЗАСПЯВАЕМ!

«ДЗЕДЗІЧ» ПРАЦЯГВАЕ ПУБЛІКАВАЦЬ ТЭКСТЫ НАЙБОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫХ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЕНЬ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ ПАД ЗВОН ГІТАРЫ. А ТЫМ, ХТО ЖАДАЕ НАБЫЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МУЗЫКУ, РАІМ ТЭЛЕФАНАВАЦЬ У РЭДАКЦЫЮ.

## СОНЦА НАМ ДАПАМОЖА

З альбому «Я нарадзіўся тут»

(Акорды падабраны Кацяй Жалабковіч)

Am C
Над нашай зямлёю – неба.
Am C
Пад нашым небам – зямля,
G
На нашай зямлі трава і вада,
Am G Am
І дрэвы, і промні святла.

Нас гэта зямля нарадзіла
Яе малако мы пілі,
І ўсё, што дае нам сілы,
¨сць на нашай зямлі.

Прыпеў:
G F
Сонца нам дапаможа,
G F
Сонца нам дапаможа,
Am
Яно любіць нас.

Дарэмна канкістадоры
Спяваюць песню вайны,
Заваяваць наша сонца і зоры
Ніколі не змогуць яны.

Нас любіць калматае сонца,
Нас любіць месяц сівы.
І сонца і месяц дадуць
Нам моцы
Для нашае барацьбы

Прыпеў.

Мінуць у тумане стагоддзі,
І сталь спарахнее ўшчэнт,
А мы тут былі, і мы тут будзем,
Пакуль існуе гэты свет.

Прыпеў.

# БЕЛАРУСКІЯ ХІТЫ ЗБІРАЮЦЦА Ў ТУЗІН

МЕДЫЯМУЗЫЧНЫ ПРАЕКТ "ТУЗІН ХІТОЎ" (HTTP://MUSIC.FROMBY.NET) РАСПАЧАЎ СВАЮ ПРАЦУ Ў СЕЦІВЕ 13 КАСТРЫЧНІКА. САЙТ ЦАЛКАМ ПРЫСВЕЧАНЫ АЙЧЫННАЙ МУЗЫЦЫ І ПЕРАДУСІМ МАЕ НА МЭЦЕ ПРАПАГАНДАВАЦЬ МУЗЫКУ, СТВОРАНУЮ ТУТ, ЗААХВОЧВАЦЬ ДА ПРАСЛУХОЎВАННЯ БЕЛАРУСКІХ ТВОРАЎ ЯК МАГА БОЛЬШУЮ КОЛЬКАСЦЬ ЛЮДЗЕЙ.

Гэты праект — чарговая спроба данесці да люду, што беларуская музыка ёсць, яна развіваецца, а галоўнае — яна чапляе. Аснова праекту — уласна хіт-парад. У яго трапляюць песні беларускіх музыкаў, пераважна на беларускай мове, запісаныя ўжо ў XXI ст. На думку арганізатараў праекту, песні якраз і існуюць для таго, каб іх слухалі, ацэньвалі, параўновалі...

Акрамя гэтага, на сайце існуюць яшчэ некалькі раздзелаў. У "Навінах" можна будзе знайсці інфармацыю, датычную беларускай музыкі. У "Рэцэнзіях" паглядзець артыкулы пра апошнія беларускія альбомы. Таксама можна пабачыць фотаздымкі айчынных музыкаў, дзеячоў беларускага шоўбізнесу — у раздзеле "Фотахроніка". ¨сць раздзел "Архіў", дзе можна будзе адшукаць вынікі мінулых галасаванняў, праслухаць песні, якія раней удзельнічалі ў хіт-парадзе. Плануецца адкрыць раздзел "Форум" для абмену думкамі, прапановамі, заўвагамі і г.д.

Музычны кірунак ролі не грае, мова твору – пажадана беларуская (выключэнні, канешне, будуць). Агулам збіраецца 12 песень – удзельнікаў туру – г.зв. тузін. На працягу двух тыдняў кожны, хто неабыякава ставіцца да беларускай музыкі, можа засведчыць сваю цікаўнасць да адной ці некалькіх песень і прагаласаваць адзін раз на дзень з аднаго кампутара, а таксама праслухаць кампазіцыю з тузіна адразу (скачаўшы low-вэрсію) ці спампаваўшы трэк у hi-версіі.

Месца кожнай кампазіцыі ў абраным тузіне залежыць ад ступені яе пранікнення ў падсвядомасць слухача. Па выніках галасавання, што доўжыцца роўна два тыдні, мы маем трох пераможцаў і трох аўтсайдэраў. Апошнія тры песні пакідаюць тузін (але іх MP3-версіі застаюцца ў архіве). На наступны тур усе галасы абнуляюцца, і ўсё пачынаецца спачатку.

Слухайце ды выбірайце!

**Dzedzich week-news**

### МУЗЫЧНЫЯ НАВІНЫ

## ДЫСКАТЭЧНЫ "НЕЙРА ДЗЮБЕЛЬ"

Ёсць верагоднасць, што ў хуткім часе на ўсіх прасунутых дыскатэках краіны люд будзе танчыць не пад Кайлі Міноўг з Рыкі Мартынам, а пад песні Сашы Кулінковіча. "Нейра дзюбель" ужо запісаў альбом "для танцаў", што мае выйсці ў гэтым месяцы. Працоўная назва – "МІХалычы (хронікі доктара Сайкова)". Як паведаміў лідэр "Нейра дзюбелю" гэта будзе "некласічны альбом рэміксаў" – папросту новы свежы погляд на старыя хіты «НД» з мінімумам кампутарных наваротаў. Так, "Скрыпка дрыгвы" будзе яшчэ болей рытмічная, зменяцца аранжыроўкі ўсім вядомых "Суслікаў-забойцаў", "Пятровай", "Паляўнічага і сайгака" etc. Акрамя таго, у галоўным хіце "дзюбелю" – "Гумавым доме" будзе замест трох куплетаў – чатыры (дарэчы, насамрэч у гэтай песні 21(!) куплет). Некалькі песняў былі адмыслова запісаныя для "МІХалычаў" і раней ніхто іх не чуў. На жаль не будзе "Я памру тут", бо дыск з арыгіналам трэку папсаваўся.



Ну, а ўжо ў наступным годзе выйдзе новы арыгінальны, пры чым цалкам беларускамоўны альбом «НД» пад назвай "Танкі". Пакуль што цалкам гатовы толькі тэкставы матэрыял (усе тэксты напісаў Кулінковіч), хутка распачнецца студыйная праца.

# ХТО ЗНІШЧЫЎ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ?

**(Працяг. Пачатак на с. 6)**

2. Збліжэнне і прыпадабленне беларускай мовы да расейскай;

3. Выцісненне беларускай мовы на перыферыю грамадскага жыцця (у вёску).

Мова начальніка, мова партыі, войска, міліцыі – расейская мова. Мова простага чалавека – беларуская. У невялікіх і занядбаных вёсках школы застаюцца беларускімі, а гарадскія – усе расейскамоўныя. Лепшую базу, лепшых выкладчыкаў, сацыяльную перавагу горада над вёскай ператвараюць у перавагу расейскасці над беларускасцю.

Практычна ўся сфера навукі расейскамоўная. Беларускай мове пакінулі вывучэнне сябе самой. На ёй хіба толькі функцыянавала мастацкая самадзейнасць на вёсцы, дзе спявалі пра лапці ды гралі на піле. У канцы 60-х гг. і беларускую літаратуру дазволілі ў многіх школах вучыць па-расейску.

Ні адной вышэйшай беларускамоўнай навучальнай установы, ні аднаго тэхнікума, ні аднаго ПТВ.

Да канца 1970-х гг. ні адна кніга сусветнай літаратуры не была перакладзена на беларускую мову (дазвалялася перакладаць пісьменнікаў Сярэдняй Азіі, Казахстана, Грузіі і г.д., каб паказаць "дружбу народаў"). Дзюма, Твен, Хэмінгуэй, нават Міцкевіч – толькі па-расейску. Не дубляваліся фільмы. "Беларусьфільм" нават "Людзей на балоце" зняў па-расейску. У рэпертуары опернага тэатра адна беларускамоўная опера – "Алеся". Толькі ў купалаўскім тэатры "Паўлінку" яшчэ дазвалялі паказваць па-беларуску, бо там – ізноў жа лапці ды мужыкі, як "сімвал" беларускага народа.

З'яўленне "Песняроў" стала магчымым таксама толькі таму, што пачалі яны з таго ж самага: "Скрыпяць мае лапці...".

Сёння нацыянальная інтэлігенцыя, як калісьці шляхта, мусіць супрацьстаяць уяўленням пра беларускі народ, як пра мужыка ў лапцях. Зноў гэты не самы багаты, але шматлікі і адукаваны пласт грамадства павінен узяць на сябе справу Вялікага нацыянальнага Адраджэння Беларускага народа.

Напрыканцы хацелася б паставіць некалькі рытарычных пытанняў для роздуму:

**– Чаму кіраўнікі грамадстваў Старажытнай Грэцыі заклікалі народ супраць Персідскай пагрозы перадусім дзеля абароны зямлі і мовы?**

**– Чаму ў новастворанай дзяржаве Ізраіль палічылі неабходным уваскрасіць старажытнагабрэйскую мову (якая ужывалася толькі ў малітвах мінімум 2000 гадоў таму), а не дзейнічалі згодна прымаўкі прыстасаванцаў: "Так ужо склалася гістарычна"?**

**– Чаму ў пераважнай большасці ўсялякая экспансія, заваёва, акупацыя маюць за мэту перадусім знішчэнне роднай мовы мясцовага насельніцтва?**

**– Чаму ўсе нацыянальныя рухі пачынаюцца з барацьбы за сваю мову і за адметную нацыянальную гісторыю?**

**– Чаму чалавек, які займае дзяржаўную пасаду, можа беспакарана здзеквацца з дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь, з нацыянальнай святыні свайго народа, зневажаць тое, што па закону, калі не па сумленню, ён павінен берагчы і бараніць?**

**Дзмітрый ШЫМАНСКІ**

# "Сцяна" – мы спяваем па-беларуску!

АБ УЗРОЎНІ РАЗВІЦЦЯ МОВЫ І КУЛЬТУРЫ ЛЮБОГА НАРОДА МОЖНА РАБІЦЬ ВЫСНОВЫ НА ПАДСТАВЕ ЛІТАРАТУРНЫХ ТВОРАЎ, СТВОРАНЫХ НОСЬБІТАМІ ГЭТАЙ МОВЫ, МАЛЯРСКІХ ДЫ АРХІТЭКТУРНЫХ ПОМНІКАЎ, ЯКІЯ ЗАСТАЛІСЯ Ў СПАДЧЫНУ ДЗЕДЗІЧАМ ДАДЗЕНАЙ КРАІНЫ. АСОБНАЕ МЕСЦА Ў РАЗВІЦЦІ ЭТНАСУ І СВЕДЧАННІ АКТЫЎНАГА УЖЫВАННЯ КАНКРЭТНАЙ МОВЫ ЗАЙМАЕ МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДУ. І ГЭТА ЦАЛКАМ ЗРАЗУМЕЛА: З ПЕСНЯЙ БЕЛАРУСЫ СВЯТКАВАЛІ НАРАДЖЭННЕ ДЗІЦЯЦІ, З ПЕСНЯЙ НАШЫЯ ПРАШЧУРЫ ПРАВАЖАЛІ ПАМЕРЛЫХ, З ПЕСНЯЙ ВЫПРАЎЛЯЛІСЯ НА БАРАЦЬБУ З ВОРАГАМ. МЕНАВІТА ТАМУ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ ПРАЦЯГВАЕ ЗНАЁМІЦЬ ЧЫТАЧОЎ З МУЗЫЧНАЙ СУБКУЛЬТУРАЙ НАШАГА РЭГІЁНУ. ТАКІМ ЧЫНАМ, СУСТРАКАЙЦЕ – АНДРЭЙ КЛІМУС, БАС-ГІТАРЫСТ МУЗЫЧНАГА ГУРТУ "СЦЯНА".



Бас-гітарыст «Сцяны» Андрэй Клімус

**Год заснавання:** 1999;
**Склад:**
Аляксей Кузняцоў - ударнік;
Андрэй Клімус - бас-гітара;
Павал Прохараў - гітара, вакал;
Яўгенія Хіло - вакал;
Ілля Дмуха - саксафон-альт;
Алесь Нікалайчык - саксафон-тэнар.
**Выйшлі запісы:** "Суб'ектывізм", "Рулет".
**Выйшлі альбомы:** "Рыфмы лёсаў" (2002).

**– Андрэй, у дадзеных палітычных умовах, калі па-беларуску не модна не тое што спяваць, а нават і размаўляць, чаму "Сцяна" абрала для сябе асноўнай мовай беларускую?**

– Напрамак ў гэты бок на пачатку быў не асэнсаваны, нават інстынктыўны. Да 2000-2001 году гурт спяваў выключна на расейскай мове. Пасля у рэпертуары пачалі з'яўляцца беларускамоўныя кампазіцыі, а потым і ўвогуле вырашылі перайсці да беларускамоўных твораў. Гэта было звязана з тым, што, па-першае, удзельнікам гурта самім спадабалася граць кампазіцыі на роднай мове, а, па-другое, на гэты момант у Берасці не было аніводнага музычнага гурта, які б спяваў па-беларуску.

**– Аб папулярнасці музычнага гурта можна рабіць высновы на падставе колькасці запрашэнняў з прапановай адыграць канцэрты. Ці паступаюць такія прапановы "Сцяне"?**

– Так, на працягу дзвух апошніх гадоў мы неаднаразова выступалі ў менскіх клубах "Танэль", "Сафары", па запрашэннях выступалі ў Беластоку. У 2002-2003 гг. бралі ўдзел у Басовішчы. Дарэчы, на Басовішча мы трапілі дзякуючы Віктару Шалкевічу, за што гурт яму вельмі ўдзячны.

**– Ці не мог бы ты падрабязней расказаць пра удзел "Сцяны" ў Басовішчы.**

– У якасці ўдзельнікаў мы ўпершыню трапілі на фэст ў 2002г., а за 25-хвілінную канцэртную праграмму ў 2003г. мы атрымалі прыз ад Radio Polonia. Акрамя нас Беларусь на Басовішчы прадстаўлялі такія гурты як: IQ 48, Куклы, Anima, Indigo ды іншыя. Усяго з канцэртнай праграмай на фэсце было 10 гуртоў: 6 – прадстаўнікі Беларусі, і 4 – польскіх гурта. Самае характэрнае, што з 6 музычных груп, якія прадстаўлялі Беларусь, з рэгіёну была толькі "Сцяна", астатнія – з Менску.

**– Восень у Берасці адзначылася актыўнасцю творчых калектываў. Я маю на ўвазе канцэрты музычных гуртоў у клубе Matrix, сярод якіх была і "Сцяна". Хто выступіў ініцыятарам гэтых мерапрыемстваў, і на колькі адпавядае абсталяванне дыскатэчнага бару ўмовам, патрэбным для таго, каб прыстойна адыграць канцэртную праграму?**

– Ідэя прыйшла аднаму з удзельнікаў групы "Skid Row". Аднак усё прайшло не так гладка, як планавалася: пасля выступу гурта "Дай дарогу!" былі адменены выступы іншых калектываў, у прыватнасці наша канцэртная праграмма разам з гуртом "Садъ". Пасля перамоваў "Сцяна" выступіла, але ўжо разам з музычным калектывам "Centurion". А што датычыцца другой часткі пытання – дык я з поўнай адказнасцю скажу, што абсталяванне клуба Matrix цалкам адпавядае патрабаванням, неабходным для правядзення канцэртаў падобнага плану. Нават з'явілася ідэя запрашаць у гэты клуб вядомыя рок-гурты з Менску ды іншых гарадоў.

**На маю думку, "Сцяна" з'яўляецца прадаўжальнікам таго музычнага напрамку, які адначы быў распачаты гуртом "Садъ" – я кажу аб тым, што ваша каманда выконвае музычныя кампазіцыі, якія можна акрэсліць, паводле жанру, як інтэлектуальны рок. Гэты напрамак, як падаецца мне, не вельмі папулярны у нашай краіне, дастаткова толькі ўзгадаць колькасць дакучлівай "папсы" ды такіх "рок-гуртоў" як "Ленинград" або "Дай дарогу!". Як ты лічыш, ці "творчасць" падобнага тыпу мае права існаваць на музычнай сцэне?**




Берасцейскі гурт «Сцяна» падчас выступу на фестывалі «Басовішча» (Беласток)

– Разумееш, з'яўленне такіх "рок-гуртоў" ды іншай бессэнсоўнай папсы матывуецца павялічэннем попыту на дадзеную творчасць, што, безумоўна, сведчыць аб нізкім узроўні адукацыі моладзі. Я кажу менавіта моладзі, таму што большая частка гэтага нізкавартаснага прадукту разлічана менавіта на моладзь. Я лічу, што з'яўленне такіх гуртоў, якія ў сваіх "кампазіцыях" без вульгарызмаў не могуць звязаць і трох слоў, прама прапарцыянальна залежыць ад сітуацыі ў грамадстве. І калі на дадзеную творчасць нараджаецца попыт – гэта сведчыць аб тым, што грамадству, прынамсі той частцы, якая лічыць сябе за інтэлегенцыю, ёсць над чым задумацца.

**– Сярод пісьменнікаў апошнія гады пашырыўся тэзіс: "Мастацтва дзеля мастацтва". Як ты лічыш, ці творчасць і палітыка – гэта рэчы сумяшчальныя?**

– Усё залежыць ад пазіцыі творцы. Калі музыкант хоча спяваць аб сацыяльных праблемах – ён аб гэтым і спявае, тым самым шукае шляхі вырашэння гэтых праблем. Мы лічым, што мастацтва не можа не закранаць праблемаў грамадства, таму што творчасць – гэта прадукт, які ствараецца і існуе дзеля грамадства. У нас грамадства – больш праблемнае, таму гэты тэзіс мы не можам аднесці да сваёй дзейнасці. Кожны, хто хоча нешта змяніць у навакольным свеце, павінен у першую чаргу змяніць самога сябе, што, дарэчы, самае складанае, таму мы імкнемся ўвесь час працаваць над сабой, самаўдасканальвацца.

**– Можа ты хацеў бы пажадаць што-небудзь нашым чытачам.**

– Не губляць веры ў будучыню, быць аптымістамі. А яшчэ, як сказаў Багушэвіч: "Не пакідайце мовы беларускай, каб не ўмерлі". Да, вось што, хацелася б выказаць вялікую падзяку ўсім тым, хто нам дапамагае.

**Гутарыў Андрусь ЛЯЎЧУК**

# ХОЧАШ КАВАЛАК МЕСЯЦА?

У БЕЛАРУСІ АДКРЫЛАСЯ ПРАДСТАЎНІЦТВА АМБАСАДЫ МЕСЯЦА НА ЗЯМЛІ. АСНОЎНАЯ СФЕРА ДЗЕЙНАСЦІ АМБАСАДЫ – ПРОДАЖ УЧАСТКАЎ НА БАЧНЫМ БОКУ МЕСЯЦА. ПА СТАНЕ НА 22 КАСТРЫЧНІКА 2003г. У БЕЛАРУСІ ПРАДАЛІ 65 УЧАСТКАЎ. У РАСЕІ АМБАСАДА МЕСЯЦА З'ЯВІЛАСЯ Ў КАНЦЫ 1998г., І З ГЭТАГА МОМАНТУ ЎЛАДАЛЬНІКАМІ ЎЧАСТКАЎ НА МЕСЯЦЫ СТАЛІ ТАКІЯ ВЯДОМЫЯ ЛЮДЗІ, ЯК АЛЕГ БАСІЛАШВІЛІ, СЯМЁН АЛЬТАЎ, АЛЯКСАНДР РАЗЭНБАУМ, ЮРЫЙ ШАЎЧУК, ЮРЫЙ СТАЯНАЎ, ІЛЛЯ АЛЕЙНІКАЎ.

Калі вы думаеце, што гэта жарт, вы памыляецеся. Проста адзін амерыканец – Дэніс Хоуп – цудоўна ведаў заканадаўства. У 1980г. ён знайшоў сур'ёзны прабел у міжнародных законах, які дазволіў яму абсалютна законна атрымаць у сваю ўласнасць тэрыторыі, якія нікому не належаць. Усё ў поўнай адпаведнасці з амерыканскімі законамі.

Вы, пэўна, чыталі Джэка Лондана, і ведаеце, што Амерыка – не Расея, там, для таго, каб забраць сабе тое, што нікому не належыць, не трэба нічога рабіць. Толькі папярэдзь усіх, каго гэта тычыцца. І калі ты робіш заяўку першым, то практычна ніякіх праблем не будзе.

Дык вось Дэніс Хоуп патрэбным чынам аформіў дакументы і падаў іх у дэпартамент, які займаецца падобнымі пытаннямі. Адмовіць прычын не знайшлося...

Пасля гэтага ён у пісьмовым выглядзе паставіў у вядомасць ААН, СССР, ЗША, Кітай, Канаду і інш. краіны аб тым, што ён у поўнай адпаведнасці з міжнароднымі законамі забірае ў сваю ўласнасць Месяц. Рэакцыі – ніякай. Канешне, таму як яшчэ ў 1967г. усе краіны-ўдзельніцы ААН падпісалі "Пагадненне аб космасе", дзе пазначана, што ніводнае астранамічнае цела, уключаючы Месяц, не падлягае нацыянальнаму прысваенню. Праўда, СССР, у свой час спрабаваў прымусіць ААН падпісаць "Пагадненне аб дзейнасці дзяржаў на Месяцы і іншых нябесных целах" ад 5 снежня 1979г., дзе Месяц і іншыя нябесныя целы абвяшчаліся "агульнай спадчынай чалавецтва" (артыкул XI). Там пазначана, што "паверхня і нетры Месяца і іншых нябесных целаў ці іх прыродныя рэсурсы там, дзе яны знаходзяцца, не могуць быць уласнасцю якіх-небудзь дзяржаў, юрыдычных ці фізічных асоб". Але ёсць адна маленькая дэталь. Гэтае пагадненне падпісалі толькі 6 краін з 113 сябраў ААН. І да гэтага часу больш ніхто не далучыўся да гэтай "шасцёркі".

Амбасада Месяца на Зямлі працуе з 1980 года. Два амерыканскіх прэзідэнта набылі ў ёй участкі на Месяцы. Не было ніводнай праблемы з законам. З кожным годам расце колькасць уладальнікаў. Магчыма, у бліжэйшы час Амбасада створыць Рэспубліку Месяца і зойме месца ў ААН.

## ШТО ВЫ НАБЫВАЕЦЕ

Сёння на продаж выстаўлены ўчасткі на бачным баку Месяца ў раёне даліны Рэйта. У глебе гэтага раёну пераважаюць анартазітавыя габро. Прыкладныя каардынаты зоны – 40-44° паўднёвай шырыні і 34-38° усходняй даўгаты.



Усе ўчасткі стандартныя, памер – 177,7 акраў (72 гектары, каля 100 футбольных пляцовак).

Кошт участка для жыхароў Беларусі – 99 у.е.

**Вы атрымліваеце:**

- Дакумент на уладанне маёмасцю – ён афіцыйна замацоўвае за вамі правы ўласніка.
- Мапа паверхні Месяца, дзе пазначана прыкладнае знаходжанне вашага ўчастка.
- Канстытуцыя Месяца (пераклад) – утрымлівае законы, дзейсныя на Месяцы і вашыя правы адносна іншых уладальнікаў.

Усе дакументы маюць памер 11x14 дзюймаў (1 дзюйм = 2,54 см), надрукаваныя на адмысловай пергаментнай паперы і вельмі эфектна глядзяцца на стенцы ці ў рамцы.

**За дадатковую плату вам прапануюць:**

– Фотаздымак паверхні Месяца ($ 15). Надзвычай рэдкі па якасці здымак месяцовага краявіда з вышыні 1000 кіламетраў. Фармат – 30x42 сантыметра.

– Сувенірная банкнота ў 100 месяцовых даляраў ($ 10).

– Пашпарт грамадзяніна Месяца ($ 39). Выдаецца выключна ўладальнікам участкаў на 25 год. Дзейнічае толькі па-за межамі Зямлі.

Сваю маёмасць на Месяцы вы можаце прадаць, падараваць і, увогуле, рабіць усё, што пажадаеце.

## ЯК НАБЫЦЬ УЧАСТАК

Беларускае прадстаўніцтва Амбасады Месяца ёсць віртуальная кампанія. У яго няма офісу. А знайсці яго супрацоўнікаў можна па адрасе http://www.lunokhod.com. Па любых пытаннях можна таксама звяртацца па тэл.: (029) 657-19-25. E-mail: info@lunokhod.com. ICQ # 36600982.

Ніжэй прапануем вам спасылкі на міжнародныя пагадненні, што тычацца статуса Месяца:

– Пагадненне аб дзейнасці дзяржаў на Месяцы і іншых нябесных целах (Нью-¨рк, 18 снежня 1979г.) – http://www.lunokhod.com/law.php?page=1

– Дамова аб прынцыпах дзейнасці дзяржаў па даследаванні і выкарыстанні касмічнай прасторы, уключаючы Месяц і іншыя нябесныя целы (Масква–Вашынгтон–Лондан, 27 студзеня 1967г.) – http://www.lunokhod.com/law.php?page=2

## ЦІКАВЫЯ СПАСЫЛКІ:

Праект Засваення Космаса (http://kuasar.narod.ru) – ідэі, якія дапамогуць чалавецтву ў засваенні касмічнай прасторы.

Энцыклапедыя "Касманаўтыка" (http://www.ipclub.ru/space) – хроніка засваення космаса.

**Дзмітрый ЛЯШОЎ**

## УВАГА!!!

**БАМГА "Сузор'е" абвяшчае дадатковы набор карэспандэнтаў у склад рэдакцыі ІАБ "Дзедзіч"**

**Студэнтаў, вучняў старэйшых класаў і ўсіх, хто жадае:**

**– Выказаць свае думкі,**
**– Навучыцца пісаць артыкулы,**
**– Зірнуць на акаляючы свет вокам журналіста,**
**– Стаць ля вытокаў стварэння новай моладзевай газеты,**

**просім звязацца з намі па тэл.: 20-57-41 з $18^{00}$ да $21^{00}$.**
**Маб.: (029) 660-57-41 (Дзмітрый), (029) 725-15-39 (Андрусь).**
**Таксама запрашаем да супрацоўніцтва мастакоў, карыкатурыстаў, фатографаў.**

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

## ПАРТЫЯ БНФ

**распачынае новую агульнагарадскую кампанію "Разам за еўрапейскі дабрабыт".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Разам мы:**

- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Адстаім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Ты зможаш:**

- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Навязаць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**
**Тэлефануй: (029) 641-20-98.**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці.**
**Тэл. (0162) 20-57-41.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці.**
**Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце:**
**(0162) 20-57-41.**

АБ'ЯВЫ

# БІБЛІЯТЭКА ДЛЯ МОЛАДЗЕВЫХ НДА

У памяшканні БАМГА "Сузор'е" адкрылася бібліятэка НДА для прадстаўнікоў моладзевых арганізацый Берасцейшчыны і проста ініцыятыўных людзей. Яна змяшчае ў сабе кнігі і дапаможнікі па арганізацыі дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Карысная літаратура па рэгістрацыі НДА, арганізацыі справаводства, пошуку фінансавання, працы з валанцёрамі, Public Relations у НДА і шмат-шмат іншай цікавай інфармацыі можна знайсці, звярнуўшыся ў БАМГА "Сузор'е".

Бібліятэка ўтрымлівае таксама літаратуру па наступных раздзелах:

– Выбары (арганізацыя выбарчый кампаніяў, агітацыя, назіранне);

– СМІ (рэгістрацыя і дзейнасць газет, рэкламная дзейнасць, нарматыўна-прававыя акты);

– Правы чалавека (метадычныя дапаможнікі, маніторынг парушэнняў правоў чалавека на Беларусі, міжнародныя акты і інш.);

– Гісторыя Беларусі (навуковыя матэрыялы, падручнікі, папулярная літаратура);

– Мовазнаўства (слоўнікі, дапаможнікі для тых, хто вывучае беларускую мову);

– Бюлетэні, брашуры і часопісы НДА Берасцейшчыны і краіны;

– Замежная літаратура (слоўнікі, кнігі, часопісы, газеты на ангельскай, польскай, украінскай, літоўскай і латвійскай мовах; матэрыялы па краязнаўству суседніх (і не вельмі) краін на беларускай мове);

– Мастацкая літаратура (на беларускай і расейскай мовах).

Бібліятэка чакае наведвальнікаў штодня з $12^{00}$ да $16^{00}$ (акрамя суботы і нядзелі). Заходзьце, не пашкадуеце. Калі патрэбнай вам літаратуры няма (і такое можа здарыцца) – супрацоўнікі бібліятэкі дапамогуць у яе пошуку.

**Dzedzich week-news**

# ПРАГРАМА ДЛЯ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА ПРАЦЫ З МОЛАДДЗЮ

Камітэт па аказанні дапамогі моладзі па даручэнню Федэральнага міністэрства па справах сям'і, састарэлых, жанчын і моладзі ФРГ у 2004г. будзе здзяйсняць праграму для спецыялістаў па працы з моладдзю і ў галіне сацыяльнай працы. Да ўдзелу ў праграме, якая разлічана на восем тыдняў (верасень-кастрычнік 2004 года), абвяшчаецца конкурс, у выніку якога будуць запрошаныя 30 замежных стыпендыянтаў з розных краінаў. Дадзеная праграма ўключае ў сябе тэматычныя дыскусіі па спецыяльнасці, наведванні і практычную работу па розных накірунках ў ФРГ.

Федэральнае міністэрства па справах сям'і, састарэлых, жанчын і моладзі кампенсуе наступныя выдаткі для ўдзельнікаў праграмы:

– кошт праезду, неабходны ў межах навучальнай праграмы па тэрыторыі ФРГ;

– кошт пражывання і выдаткі на харчаванне. Удзельнікі праграмы размяшчаюцца ў гатэлях і месцах для раьмяшчэння ўдзельнікаў канферэнцый і семінараў;

– страхоўкі: выдаткі ў выпадку захворвання, якое выявілася падчас удзелу ў праграме, аплочваюцца медычнай страхоўкай. Акрамя таго, набываецца страхоўка ад няшчасных выпадкаў і страхавання адказнасці.

Умовай для ўдзелу ў конкурсе з'яўляецца асноўная штатная сацыяльна-педагагічная дзейнасць ці праца на грамадскіх пачатках ва ўстановах і арганізацыях па аказанні дапамогі дзецям і моладзі, а таксама ў сферы сацыяльнай працы.

Асобамі, якія займаюцца штатнай прафесійнай дзейнасцю лічацца сацыяльныя работнікі, выхавацелі, спецыяльныя педагогі і інш. Прадстаўнікі іншых прафесій таксама могуць браць удзел у конкурсе, калі яны займаюцца практычный дзейнасцю ў вышэйназваных сферах. Маецца на ўвазе, што пасля атрымання прафесійнай кваліфікацыі ёсць досвед практычнай работы не менш за год. Кіраўнікі моладзевых груп павінны мець падцверджанне практычнай работы на грамадскіх пачатках на працягу трох гадоў і пастаянна займацца працай з дзецьмі і моладдзю, а таксама сацыяльнай работай.

Іншыя ўмовы:

– ўзрост ад 25 да 45 гадоў;

– практычная дзейнасць ў сферы аказання дапамогі дзецям і моладзі, а таксама ў сферы сацыяльнай працы і рэабілітацыі;

– добра разумець і размаўляць па-нямецку, каб актыўна ўдзельнічаць ў дыскусіях і семінарах.

Жадаючых узяць удзел ў дадзеным конкурсе просім звяртацца да 1 снежня 2003г. пісьмова ў Амбасаду Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Менску, аддзел культуры, па адрасе:

Вул.Захарава, 26, 220034 Менск.

Тэл.: 284-42-17, 284-87-14. Факс: 236-85-52.

Эл.пошта: germanembassy@mail.belpak.by

Удзельнікі конкурсу, якія адпавядаюць названым умовам, будуць запрошаныя на сумоўе.

**Dzedzich week-news**

# УВАЗЕ ЎСІХ СТУДЭНТАЎ АД 18 ДА 24 ГАДОЎ!

Усходне-еўрапейскі дэмакратычны цэнтр запрашае вас да ўдзелу ў 6-й міжнароднай канферэнцыі па моладзевым лідэрстве, якая адбудзецца 4-9 лютага 2004г. у Празе. У вас будзе магчымасць наведаць гістарычныя месцы Прагі, Сенат, Міністэрства замежных справаў, узяць удзел ў ралевой гульні, дзе вы будзеце дыпламатычнымі прадстаўнікамі вашай краіны, і г.д. Канферэнцыя стане для вас незабыўнай падзеяй!

Заяўкі на ўдзел ў канферэнцыі прымаюцца ў рэжыме он-лайн. Больш падрабязную інфармацыю вы знойдзеце на сайце: http://www.czechleadership.com.

**Dzedzich week-news**

**Фонд «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

## WEB-ДЫЗАЙНЕРА

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**

**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**

**Тэл.: (029 )660-57-41.**

## БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА ЗАПРАШАЕ

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

## ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв.4.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:

## УВАГА!

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымліваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, пр-т Машэрава, д. 39, кв. 4.**

Чаму ты вырашыў падпісацца:

Прозвішча:

Імя:

Імя па бацьку:

Паштовы адрас:

Тэлефон:

## ДАРЭЧЫ

У пустыні сустрэліся трое. Адзін кажа:
– У нас такая засуха была, што зямля трэшчынамі пайшла па поўметры шырынёй!
Другі адказвае:
– Гэта што! Вось у нас у мінулым годзе ў засуху каровы сухім малаком даіліся!
Трэці маша рукой:
– Што вы разумееце! Вось у нас была засуха – дык дрэвы за собакамі ганяліся, каб тыя на іх брызнулі!

***

Экскурсія ў заапарку. Гід:
– Гэта слон. Жыве ў джунглях Індыі, палавы акт цягнецца дзве гадзіны.
Жонка мужу:
– Чуў?!!
Муж засумаваў. Ідуць далей. Гід:
– Гэта бегемот. Жыве ў балотах Афрыкі. Палавы акт цягнецца паўтары гадзіны.
Жонка:
– Чуў?!
Муж галаву апусціў. Ідуць далей. Гід:
– Гэта паўночны алень. Жыве ў тундре. Палавы акт цягнецца паўтары хвіліны.
Муж:
– О! Чула? Чула?!
Жонка:
– Дурань! Паглядзі, якія ў яго рогі!!!

***

Сядзіць “нарык” дома, чакае сяброў і забівае “касяк”. Думае: “Блін, зараз сябры прыйдуць, а я пад кайфам не буду ведаць, што рабіць. Трэба напісаць на паперцы і павесіць на дзвярох!” Праз колькі часу званок у дзверы. “Нарык падыходзіць і чытае: “Хто там пытальнік”. З-за дзвярэй: “Гэта мы коска Коля коска працяжнік твае сябры”.

***

Прыходзіць габрэй да равіна:
– Рэбе, у мяне праблема. У мяне два гусі, белы і шэры, аднаго трэба закалоць... Якога?
Равін:
– Закалі белага!
Мужык:
– Не магу, шэры будзе сумаваць...
– Тады закалі шэрага!
– Не магу, белы будзе сумаваць...
– Ну, закалі абодвух!
– Не-е, тады я буду сумаваць, ды і аднаго ўсяго закалоць трэба.
– Ты ведаеш, я не магу табе дапамагчы. Схадзі, вунь, праз дарогу, там праваслаўная царква, можа бацюшка прыдумае. Мужык ідзе да бацюшкі - маўляў, так і так, хаця я і не вашай канфесіі, але ваш калега параіў і г.д.
Бацюшка:
– Слухаю цябе, сын мой...
Мужык яму:
- У мяне два гусі, белы і шэры, аднаго трэба закалоць... Якога?
– Закалі белага!
– Не магу, шэры будзе сумаваць...
– Ну і х... з ім!!!

***

Як казаў М. В. Гогаль, рэдкі верталёт даляціць да сярэдзіны Чачэніі.
– Ці існуе магчымы варыянт паспяховага заканчэння беларуска-расейскай інтэграцыі?
– Іх нават два. Першы – рэалістычны. Гэта калі да нас прыляцяць марсіяне і нас усіх інтэгруюць. Другі – фантастычны, калі Беларусь і Расея аб'ядноюцца самі.

***

– Я у вас кампутар набыў... Дык ён здох!
– Гарантыя якая?
– Пажыццёвая!
– Калі здох – гарантыя скончылася...

***

Казіно. Хутка раніца. Амаль усе разыйшліся, ля дальняга стала з рулеткай пазяхаюць два круп'е. Раптам да стала падыходзіць, як кажуць, абсалютна чумавая дзяўчына.
– Хачу згуляць.
– Калі ласка.
– Толькі адзін раз.
– Калі ласка.
– Пастаўлю на нумар 1000 даляраў.
– Ого! Ну, калі ласка.
– Я абавязкова выйграю. Я заўжды выйграю.
– Жадаем поспеху.
– У мяне ёсць шчаслівы метад. Я буду гуляць без спадніцы і без трусікаў. Вы не супраць?
Круп'е пацяху ахрэневаюць.
– Чаму супраць? Калі ласка.
Дзяўчына здымае спадніцу, трусікі.
– Пускайце шарык.
Круп'е кідае шарык. Дзяўчына пачынае уздымацца з-за стала.
– Ну, давай, ну давай, ну, НУ, НУ!.. НУ!!.. НУ!!!.. НУ!!!!!! УРА-А-А-А-А!!!!! Што я казала!!!
Кідаецца да круп'е, пачынае іх абдымаць, цалуе шарык...
Адурэлыя круп'е тупа адлічваюць ёй фішкі, яна апранаецца і сыходзіць...
Адзін круп'е кажа другому:
– М-да! Бывае ж такое! Дарэчы, што выпала?
– Два дэбіла! А на што хаця б яна паставіла?

***

Чарговага поспеху дасягнулі барацьбіты за чысціню расейскай мовы. Цяпер муха ЦЕ-ЦЕ перайменавана ў муху ЭТО-ЭТО!

***

Нашыя вучоныя распрацавалі новы метад рэкламы! Вы поўгады не плаціце рабочым свайго завода заробак, і аб вашым заводзе бясплатна расказваюць па ОНТ.

***

Урок у школе. Раптам хтосьці грукае ў дзверы. Заходзіць Вовачка, увесь такі растрапаны, раскудлачаны, шырынка расшпілена...
– Любоў Міхайлаўна. Прабачце за спазненне, можна ўвайсці?
– Нельга, пакуль не адкажаш, дзе быў.
– Бульбу смажыў, Любоў Міхайлаўна!
– Бульбу смажыў? Ну, калі бульбу смажыў – добра, праходзь. Але больш не спазняйся!
Тут праз некалькі хвілін забягае дзяўчынка, таксама ўся раскудлачаная, спадніца задраная... Настаўніца пераводзіць на яе позірк...
– Так! Ну, а ты, Бульбашкіна, дзе была?

***

Што агульнага паміж бландзінкай і інтэрнэтам? Вельмі шмат карыстальнікаў...
Заблукаў маленькі хлопчык, стаіць, плача:
– А-а-а-а-а-а!
– Хлопчык, ты што, заблукаў? - пытаюць мінакі.
– Т-а-а-а-к!!! А-а-а-а-а...
– Хлопчык, не плач, як цябе клічуць?
– А-а-а-а-а! Я-а-ак та-а-а-ату...
– А як жа клічуць тваго тату?
– Я-а-ак мяне-е-е-е...
– Я як вас абодвух клічуць?
– Адно-о-о-лька-а-а-ава! А-а-а-а...

***

Калі б спорт прыносіў карысць – на кожным турніку вісела б па пяць габрэеў...

***

Чым адрозніваецца расеец ад украінскага сабакі?
Сабака разумее і па-расейску, і па-украінскі...

***

– І што, цябе жонка кожны дзень б'е патэльняй па твары?
– Ага! Затое блінчыкі на мяне падобныя…

***

Заходзіць настаўніца ў клас:
– Дзеці, сёння да нас на чацвёрты ўрок ангельскай мовы прыедзе камісія з раённай адміністрацыі. Глядзіце, каб быў лес рук і паводзьце сябе добра.
І вось на чацвёрты ўрок прыходзіць гэтая камісія – чалавек пяць. Як звычайна сядае на задніх партах, аднаму мужыку толькі месца не хапіла і ён сеў побач з адным хлопчыкам, за перадапошняй партай. Пачынаецца ўрок, настаўніца:
– Я зараз напішу на дошцы сказ. Хто яго першым прачытае і перакладзе, той атрымае «5».
І пачынае пісаць. На сярэдзіне сказа раняе крэйду, і нахіляецца, каб яе падняць, дапісвае сказ, і пытае ў класа:
– Ну, хто гатовы адказваць?
Хлопец ззаду цягне руку. Настаўніца:
– Ну, адказвай Сідараў.
Сідараў:
– Вось гэта попа, вось бы засмажыць.
Настаўніца чырванее, выплюшчвае вочы і выстаўляе Сідарава з класы. Сідараў спыняецца ля дзвярэй, паварочваецца, і кажа:
– А ты, мужык з адміністрацыі, не ведаеш, не падказвай.

***

У аднаго калгасніка ўвесь час кралі кавуны. У рэшце рэшт, ён вырашыў павесіць на поле такую таблічку: «Асцярожна! У адным з кавуноў – атрута!».
На наступны дзень ён убачыў, што нічога не скралі, але ж на таблічцы была прыпіска: «Цяпер іх два!».

***

– А мой сусед раніцай халоднай вадой абліваецца.
– ¨н што, морж?
– Не, хуліган...

***

Ідзе стары габрэй па дарозе, цяжка кульгаючы. Тут яго абганяе малады габрэй. Стары яму крычыць:
– Малады чалавек, вы ў пякарню?
– Так!
– Тады вы за мной!

№5 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
лістапад 2003

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 17.11.2003 у 18⁰⁰
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, Д. Дзянісаў, Д. Шастак, М. Есіна, А.Верамчук, У. Чаберкус
**Адказны сакратар:** М. Сялягін. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 20-57-41, (029) 660-57-41
**E-mail:** dzedzich@mail.ru